Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 СНЕЖНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 238 (28348)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## З днём нараджэння Паэта

*Удзельнікам урачыстасцяў з нагоды 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча*

**Дарагія сябры!**

Сардэчна віншую вас са 125-годдзем з дня нараджэння Максіма Багдановіча — нашага сусветна вядомага і паважанага паэта.

Яго вытанчаныя, дасканалыя вершы, якія вызначаюцца майстэрскім выкарыстаннем вобразна-выяўленчых сродкаў, пранікненнем у духоўны свет чалавека і высокай культурай слова, па праве прызнаны адной з вяршынь еўрапейскай паэзіі XX стагоддзя.

Сваёй дзейнасцю пясняр заклаў падмурак беларускай нацыянальнай эстэтыкі, унёс вялікі ўклад у фарміраванне літаратурнай мовы і станаўленне патрыятычнай свядомасці народа. Таму сёння мы, грамадзяне суверэннай дзяржавы, павінны шанаваць і захоўваць тое, дзеля чаго працаваў наш знакаміты зямляк, — гістарычную памяць, роднае слова, моцную краіну.

Упэўнены, урачыстасці з нагоды 125-годдзя Максіма Багдановіча паспрыяюць умацаванню еднасці грамадства і ўслаўленню творчых талентаў нашага народа.

Жадаю вам, дарагія сябры, здароўя, шчасця і поспехаў у высакародным служэнні Радзіме.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

# МАКСІМАЎ ДЗЕНЬ: СВЯТКУЙМА РАЗАМ!

## Адкрыццё кнігарні «Вянок», абноўленай экспазіцыі Літаратурнага музея і «Беларускай хаткі»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падчас урачыстага адкрыцця абноўленай экспазіцыі Літаратурнага музея паэта, героя Багдановіча ўвасобяць артысты Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі». У вобразе музыкі з дэбютнага апавядання Багдановіча рыхтуецца выступіць намеснік дырэктара «Харошак», выдатны скрыпач Аляксандр НІКІТА, якога наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук сустрэў учора ўвечары ў музеі падчас генеральнай рэпетыцыі. Падтрымаць тату прыйшоў і Дамінік Нікіта, які таксама вучыцца граць на скрыпцы.

**Гэта далёка не ўсе святочныя імпрэзы, запланаваныя на дзень нараджэння Паэта, якія мы адзначаем сёння. Шырокая ўвага грамадскасці да 125-годдзя Максіма Багдановіча, аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратурнай традыцыі, сведчыць пра павагу нашага народа да спадчыны і памяці Страціма. Больш за тое, свята стане важным акцэнтам Года культуры.**

СТАР. 3

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Наспела неабходнасць сустрэчы лідараў Расіі, ЗША, Еўрасаюза і Кітая для адкрытага абмену думкамі аб прычынах крызісу ў міжнародных адносінах. Важна пакласці пачатак асэнсаванню новых правілаў шматпалярнасці, якая фарміруецца, пры безумоўнай павазе інтарэсаў адзін аднаго. Пры неабходнасці — падключыць да гэтага працэсу міжнародную экспертную супольнасць. Беларусь гатова арганізаваць адпаведныя сустрэчы ў Мінску».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9746 | ▼ |
| Еўра | 2,1262 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0311 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0765 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Пад аховай

# ЖАРТЫ ТУТ НЕ ДА МЕСЦА

## Як кантралююць бяспеку мінскай падземкі



**Метро па праву лічыцца самым зручным відам грамадскага транспарту. Адно «але» — яго выкарыстанне патрабуе асцярогі. Толькі таго факта, што ты апынаешся ў закрытай прасторы дзесьці ў нетрах горада, дастаткова для таго, каб адчуць пэўны псіхалагічны дыскамфорт. А калі ўзяць пад увагу, што любое здарэнне пад зямлёй будзе мець больш сур'ёзныя наступствы, чым на адкрытым паветры, то і зусім становіцца не па сабе. Менавіта таму бяспека метро на асаблівым кантролі. Аб мерах па яе захаванні расказаў намеснік начальніка УУС па ахове Мінскага метрапалітэна па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні Мікалай ГЛАЗКО.**

Перыядычна СМІ паведамляюць пра тое, што на той ці іншай станцыі метро быў знойдзены падазроны прадмет ці хтосьці заявіў аб яго мініраванні. Калі зыходзіць з практыкі гэтага года: у 100% выпадкаў пераажыванні былі дарэмнымі!

Сёлета ў дачыненні да пасажыраў падземкі было ўзбуджана 6 крымінальных спраў згодна з Артыкулам 340 Крымінальнага кодэкса РБ па абвінавачванні ў загадзя ілжывым паведамленні аб небяспецы. Яшчэ па двух фактах зараз сумесна са Следчым камітэтам праводзіцца праверка. Сітуацыі, якія папярэднічаюць узбуджэнню крымінальнай справы, часцей за ўсё разгортваюцца па адным сцэнарыі. Чалавек адмаўляецца прад'явіць свае рэчы для агляду, а пасля працяглых прэчак заяўляе, што там бомба.

СТАР. 4

■ Бацькоўскі сход

# АДЧУЦЬ СЯБЕ СЯМ'ЁЙ

## Гісторыя брастаўчанкі, якая стала прыёмнай мамай



**З Юліяй Гуляевай мы пазнаёміліся на ранішніку для прыёмных сем'яў. Тады і дамовіліся сустрэцца асобна, каб пагаварыць пра тое, як яна стала мамай маленькай дзяўчынкі Васілінкі. І вось мы сядзім у маім кабінеце і размаўляем пра жыццё.**

І ў гэтым аповедзе звычайнай, на першы погляд, жанчыны я шукаю вытокі таго ўчынку, які шмат у чым змяніў яе жыццё. Юлія вырасла ў Брэсце. Для дзяўчынкі з матэматычным складам розуму і здольнасцямі да дакладных навук пытанне аб выбары вышэйшай навучальнай установы не стаяла. Ёй і паступаць не давялося: на фізічна-матэматычны факультэт Брэсцкага ўніверсітэта залічылі па выніках алімпіяды. Матэматыка ёй давалася надзвычай лёгка, вучыцца было цікава. Студэнцкія гады праляцелі на адным дыханні. А вось выкладанне ў школе, настаўніцкая работа — аказалася не яе справай. Гэта зразумела хутка, за першыя паўгода работы ў школе. І абавязковыя два гады пасля бюджэтнай формы навучання адпрацоўвала ў дзіцячым садку. Там маладая выхавацелька адчувала сябе больш камфортна.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ДАМОЎЛЕНАСЦІ ПАВІННЫ ВЫКОНВАЦЦА

**Дзейнасці Знешэканамбанка ў Беларусі гарантаваная падтрымка**

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы са старшынёй расійскай дзяржаўнай карпарацыі «Банк развіцця і знешнеэканамічнай дзейнасці (Знешэканамбанк)» Сяргеем ГАРКОВЫМ.**

«Публічна хачу сказаць, што вы заўсёды будзеце мець і ад мяне, і ад урада, Нацыянальнага банка перш за ўсё, падтрымку. Але калі вы будзеце ставіцца да нас і нашых прадпрыемстваў, да фізічных, юрыдычных асоб, як у Расіі. Для вас Беларусь павінна быць як Расія», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў ЗЭБ за падтрымку, якая аказвалася Беларусі нават у самыя складаныя часы. «Вы не адмаўляліся ад супрацоўніцтва з Беларуссю, — сказаў беларускі лідар. — Вы крэдытуеце нашы найбуйнейшыя прадпрыемствы на сотні мільёнаў долараў. Я вельмі цаню тое, што ў цяжкія часы вы не кінулі займацца гэтым пытаннем. Гэта сведчыць аб тым, што вы сур'ёзна прыйшлі у Беларусь і гатовыя тут працаваць».

Гаворачы аб банкаўскай сістэме Беларусі, Прэзідэнт сказаў, што яна, магчыма, некалькі адрозніваецца ад расійскай, але толькі знешне. «Я цалкам пераклаў адказнасць за функцыянаванне ўсёй сістэмы (не толькі першага і другога ўзроўняў) на старшыню праўлення Нацыянальнага банка, перадаў яму ўсе паўнамоцтвы. Тым больш, у нас кіруемая сістэма. Кадравыя прызначэнні ўзгадняюцца з Нацыянальным банкам, а праз яго з Прэзідэнтам. Я ніколі не дапушчу, каб тут былі несумленныя адносіны да нейкіх банкаў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, існуюць пэўныя крытэрыі ацэнкі банкаў. Пры гэтым такая сфера ў Беларусі адкрыта для прыходу новых банкаўскіх арганізацый. «У нас няма гэтага бар'ера. Мы адмовіліся ад таго, каб былі толькі дзяржаўныя і толькі беларускія банкі. Калі мы складаем з імі пагадненне, і гэта адпавядае нашым інтарэсам, мы будзем іх падтрымліваць, як беларускія банкі, не важна, дзяржаўныя ці прыватныя», — заявіў Прэзідэнт.

«Самае галоўнае, каб тут быў парадак, каб выконваліся дамоўленасці. Каб у аснове адносін былі сумленныя і абавязковыя пагадненні. Гэта я вам магу гарантаваць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«У нас ужо фактычна дзевяць гадоў супрацоўніцтва. Больш за мільярд долараў агульных інвестыцый. Ёсць буйныя праекты, як атамная станцыя, — сказаў у сваю чаргу старшыня Знешэканамбанка. — У нас ёсць цікавыя прапановы па павелічэнні сумеснага экспарту Беларусі і Расіі. Мы дамовіліся з урадам падпісаць пра гэта пагадненне. Ёсць шмат магчымасцяў для пашырэння супрацоўніцтва».

На сустрэчы абмяркоўваліся планы па стварэнні інтэграцыйнай платформы развіцця, што ў тым ліку заклікана садзейнічаць умацаванню ўзаемнага тавараабароту паміж Беларуссю і Расіяй, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Выказана ўзаемная зацікаўленасць у далейшым пашырэнні ўзаемадзеяння па такіх перспектыўных напрамках, як інвестыцыйнае супрацоўніцтва, прасоўванне экспарту ў трэція краіны, падтрымка сумесных інавацыйных праектаў.

# БУДУЧЫНЯ САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ

**Замацаванне маладых спецыялістаў ва ўстановах аховы здароўя, адукацыі, культуры і спорту залежыць ад якасці работы мясцовых органаў улады. Такое меркаванне выказала намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА па выніках семінара-нарады па актуальных пытаннях сацыяльнай сферы, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Па словах віцэ-прэм'ера, пытанне замацавання спецыялістаў сацыяльнай сферы па-ранейшаму застаецца актуальным і вострым. «Гэта пытанні мясцовых органаў улады. Для маладых спецыялістаў варта ствараць такія ўмовы, каб яны захацелі застацца працаваць у той ці іншай мясцовасці. У першую чаргу іх варта забяспечваць дастойным жыллём. Магчыма, у некаторых выпадках кіраўніцтву гарраймыканкамаў трэба працаваць у звязцы з кіраўнікамі мясцовых прадпрыемстваў, на балансе якіх знаходзяцца інтэрнаты, каб прадугледзець нейкі працэнт выдзялення месцаў для маладых работнікаў сацыяльнай сферы», — сказала віцэ-прэм'ер.

На думку Наталлі Качанавай, варта больш дэталёва прапрацаваць пытанне па выдачы мэтавых накіраванняў на вучобу. «Іх трэба выдаваць там, дзе сапраўды патрэбныя спецыялісты або дзе іх зусім няма», — лічыць намеснік кіраўніка беларускага ўрада.

## АД СУБОТЫ ДА СУБОТЫ

**З 9 раніцы і да поўдня на сувязі з насельніцтвам — прадстаўнікі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі спраў.**

Адказваць на пытанні і дапамагаць вырашаць праблемы 10 снежня будуць:

**Брэсцкі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ТОКАР Мікалай Васільевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

■ Парламенцкі дзённік

# І ДАПАМОГА, І ЗАРОБАК

## Дэпутаты распрацоўваюць законапраект, які палепшыць жыццё сем'яў з дзецьмі

**Законапраект таксама арыентаваны на падтрымку маладых маці, якія атрымліваюць дапамогу па цяжарнасці і родах, і сем'яў, што выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, што выхоўваюць дзяцей» паступіў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў верасні бягучага года. Учора адбылося пашыранае пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, дзе парламентарыі, прадстаўнікі зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў абмеркавалі нюансы будучага прымянення дакумента.**

Новаўвядзенні, якія ёсць у гэтым дакументе, даюць права сем'ям, дзе бацькі з'яўляюцца інвалідамі першай або другой групы (або адзін з бацькоў мае такую інваліднасць, а другі — здзяйсняе за ім догляд), атрымліваць дапамогу на дзяцей, узрост якіх перавышае тры гады. Грашовыя субсідыі такія сем'і змогуць атрымліваць да дасягнення дзецьмі 18-гадовага ўзросту.

— Пры гэтым не ўлічваецца той факт, што дзеці навучаюцца ў навучальных установах на бясплатнай аснове, — падкрэсліла намеснік старшыні профільнай камісіі Валянціна Курсевіч. — Раней заканадаўства вызначала, што ў такіх сем'ях, калі дзіця паступае ў прафесійна-тэхнічную, сярэдне-спецыяльную або вышэйшую навучальную ўстанову на бясплатную форму навучання, права на атрыманне дапамогі знікае. Тое ж самае адбывалася, калі дзеці дасягаюць 16-гадовага ўзросту.

Другое новаўвядзенне заключаецца ў тым, што маці, мачаха, бацька, айчым, усынавіцель, апякун, папячыцель, якія даглядаюць за дзецьмі-інвалідамі, атрымліваюць права працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці. Паралельна яны змогуць атрымліваць дапамогу па доглядзе за дзіцем-інвалідам.

— Акрамя таго, гэта права будзе захоўвацца ў выпадку атрымання бацькамі пенсіі або штомесячнай страхавой выплаты, — дадала парламентарый. — Зараз такога няма.

Яшчэ адна навацыя — дыферэнцыраваны падыход да налічэння пенсій і дапамог па доглядзе за дзіцем-інвалідам да дасягнення ім 18-гадовага ўзросту. Грошы налічваюцца ў залежнасці ад ступені страты здароўя дзіцяці.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# ПРАЗ ІНВЕСТЫЦЫІ — ДА АДНАЎЛЕННЯ



**Чэрыкаўскі раён — адзін з тых, якія традыцыйна называюць праблемнымі. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС пакінула моцны адбітак на экалогіі рэгіёна, што ў сваю чаргу паўплывала на эканоміку, дэмаграфію і іншыя паказчыкі. Тым не менш, тут праводзіцца вялікая работа па нівеліраванні наступстваў катастрофы. Яшчэ летась Прэзідэнт краіны падпісаў указ, які павінен паспрыяць больш актыўнаму развіццю эканомікі і сацыяльнай сферы ў пацярпелых раёнах Магілёўшчыны. Пра тое, як прасоўваецца працэс яго рэалізацыі і іншыя аспекты жыцця на Чэрыкаўшчыне «Звяздзе» расказаў старшыня Чэрыкаўскага райвыканкама Міхаіл КАСМАЧОЎ.**

***— Як у раёне праходзіць рэалізацыя мэтавай праграмы па комплексным сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці? Ці ёсць канкрэтныя прыклады яе ўвасаблення?***

— За 10 месяцаў гэтага года ў эканоміцы раёна, у тым ліку на рэалізацыю мерапрыемстваў праграмы, выкарыстана 15 мільёнаў рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што на 8,1 працэнта больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Адзін з прыкладаў — запуск інвестыцыйнага праекта «Мадэрнізацыя цэха дрэваапрацоўкі вёскі Гронаў» Чэрыкаўскага лясгаса. Сёлета закуплены і ўстаноўлены дзве сушыльныя камеры рабочым аб'ёмам 50 кубаметраў кожная, што дазволіць павялічыць аб'ёмы вытворчасці сушанай пілапрадукцыі, перапрацоўкі буйнатаварнай драўніны і нарасціць экспарт гэтых тавараў. Акрамя таго, уведзена ў эксплуатацыю фотаэлектрычная станцыя для вытворчасці энергіі на тэрыторыі Чэрыкаўскага раёна. Адным з галоўных вынікаў рэалізацыі гэтых і іншых мерапрыемстваў праграмы з'яўляецца стварэнне працоўных месцаў.

***— Напэўна, цяпер галоўны інвестпраект Чэрыкаўшчыны — стварэнне сонечнага парка магутнасцю 109 МВт. На якім этапе ён знаходзіцца цяпер?***

— Сапраўды, у нашым раёне будзе створаны сонечны парк, які па сваіх памерах і магутнасці стане самым буйным у Беларусі і адным з буйнейшых у Еўропе. Энергія, атрыманая там, будзе паступаць у сеткі «Магілёўэнерга». Яе хопіць, каб забяспечыць электрычнасцю жылы сектар адразу некалькі раёнаў вобласці. Праект плануецца рэалізаваць да 2019 года. У цяперашні час завершана праектаванне і афармленне дакументаў, патрэбных для пачатку будаўніцтва. Прыемна ўсведамляць, што хутка «зялёная» энергія ўвойдзе ў кожны дом. У выніку рэалізацыі павялічацца падатковыя адлічэнні ў бюджэт, зноў-такі, будуць створаны дадатковыя працоўныя месцы.

***— Зусім нядаўна Чэрыкаў прымаў удзельнікаў форуму па традыцыйнай культуры, які праходзіў у Магілёве. А як у цэлым прайшоў Год культуры ў рэгіёне?***

— Калі казаць коратка — насычана і плённа. На працягу года новы раённы Цэнтр культуры прымаў гасцей не толькі з Магілёўшчыны, але і з іншых рэгіёнаў і краін. Сёлета ў рамках раённага свята «Бразгун» адбыўся трэці рэгіянальны конкурс ансамбляў фальклорнай і народнай песні «З веку ў век». У аграгарадку Верамейкі ярка і незабыўна прайшоў фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2016». Два народных калектывы, адзін узорны, дзве ўстановы культуры адзначылі свае юбілеі з дня ўтварэння. У лістападзе ў рамках творчага праекта «Фестываль народных талентаў Магілёўшчыны» ў адміністрацыйным цэнтры вобласці адбылася творчая прэзентацыя талентаў Прысожскага краю. У будучым годзе работа ўстаноў культуры па захаванні і прапагандзе гістарычна-культурнай спадчыны раёна, развіцці дэкаратыўна-прыкладной творчасці, арганізацыі і правядзенні раённых святаў будзе працягнута.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Мы і свет

# «СТАРТАВАЯ ПЛЯЦОЎКА» ІНТЭГРАЦЫІ

**Учора ў Выканкаме Садружнасці Незалежных Дзяржаў прайшла міжнародная канферэнцыя «Мінскага дыялогу» «25 гадоў без СССР: куды вядуць постсавецкія траекторыі?». Удзельнікі абмеркавалі здабыткі і страты краін, што раней уваходзілі ў Савецкі Саюз.**

**Намеснік міністра замежных спраў Яўген ШАСТАКОЎ** заявіў, што ўнікальнасць Садружнасці можна ахарактарызаваць наступным чынам: агульная культурна-гістарычная спадчына, памножаная на ўсёбаковае шматпланавае супрацоўніцтва.

Намеснік кіраўніка дыпламатычнага ведамства звярнуў увагу, што ні адно з постсавецкіх інтэграцыйных аб'яднанняў не церпіць сёння такой жорсткай крытыкі, як СНД.

— І пры гэтым усе яны без выключэння: і Саюзная беларуска-расійская дзяржава, і Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы, і Еўразійская эканамічная супольнасць, вобразна кажучы, — «выйшлі з СНД», — адзначыў Яўген Шастакоў. — Іх удзельнікі выбудоўваюць інтэграцыйныя сувязі, якія ў той ці іншай меры карэлююць з працэсамі, пачатымі менавіта ў Садружнасці. Ідуць складаныя працэсы самаўсвядомлення, пошуку і запаўнення ўласных ніш, адсячэння дублюючых альбо непатрэбных функцый. Не памылюся, калі скажу, што менавіта СНД у найбольшай меры асацыюецца з постсавецкай прасторай.

**Раман АЛЯХНОВІЧ**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже арестованного недвижимого имущества**

**ЛОТ №1: Капитальное строение с инв. № 720/С-14815 – Садовый домик**, расположенный по адресу: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, садоводческое товарищество «Садовод», участок № 1205: общ. пл. 10,9 кв.м, год постройки – 2007 г., фундамент – деревянный, стены – дощатые, перекрытия – деревянные, кровля – шифер.
Сведения о земельном участке: кадастровый номер 722050100003000660 (право пожизненного наследуемого владения), расположен по адресу: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, садоводческое товарищество «Садовод», участок № 1205, площадь 0,0749 га, назначение – земельный участок для коллективного садоводства.
**Начальная цена продажи – 570,81 рубля в денежных знаках образца 2009 г.,** или 5 708 100 рублей в денежных знаках образца 2000 г.
**Сумма задатка 57,08 рубля в денежных знаках образца 2009 г.,** или 570 800 рублей в ден. знаках образца 2000 г.

| | |
|---|---|
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО 153001369 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 10 января 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 09 января 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона |

Информация о первом аукционе размещена в номере газеты «Звязда» от 11.10.2016

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25.**

# МАКСІМАЎ ДЗЕНЬ: СВЯТКУЙМА РАЗАМ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Духоўнасць, вернасць высокім ідэалам — адна з рыс паэзіі і філасофскай прозы Багдановіча. Таму не выпадкова святкаванне дня яго нараджэння распачнецца сёння ў **Храме-помніку Усіх святых.** Цырымонія «Вяртанне» надасць гэтаму знакаваму месцу ў сталіцы яшчэ адну сімвалічную рысу: менавіта тут, у крыпце храма, будзе закладзена капсула з зямлёй з месца пахавання Максіма ў Ялце.

На дзень нараджэння прынята дарыць падарункі імянінніку. Але здараецца, што і самі віноўнікі свята адорваюць гасцей. Так, усе мінчане і госці горада сёння атрымаюць падарункі ад Максіма-кніжніка. На **Траецкай набярэжнай** урачыста адчыніць дзверы абноўленая кнігарня «Вянок». Сёлета ў легендарнай крамы змяніўся ўладальнік — цяпер гэта ААТ «Белкніга», праведзены рамонт, адбылася невялікая перааріентацыя ў профілі. Усіх сакрэтаў арганізатары свята і супрацоўнікі крамы пакуль не раскрываюць. Але мы даведаліся, што на цырымоніі адкрыцця чакаюцца высокія госці, сярод іх — намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава, міністр інфармацыі Лілія Ананіч, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір Калтовіч, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, кіраўнікі дзяржаўных выдавецтваў. Падчас імпрэзы адкрыцця пройдзе тэатралізаванае прадстаўленне з удзелам акцёраў Купалаўскага тэатра Андрэя і Крысціны Дробышаў. Яны з'явяцца ў вобразах Максіма Багдановіча і Ганны Какуевай. Таксама будзе прадстаўлена выстаўка выданняў твораў Максіма Багдановіча з фондаў Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі. Сам «Вянок» у хуткім часе ператворыцца ў сапраўдны пісьменніцкі клуб, дзе будуць ладзіцца сустрэчы з чытачамі, прэзентацыі кніг. Думаецца, сам Максім ухваліў бы тэндэнцыю ператварэння сімвала яго кнігі паэзіі ў знак цэнтра кніжнасці.

Святкаванне працягнецца там жа, у Траецкім. Непадалёк ад «Вянка» на вуліцы М. Багдановіча месціцца Літаратурны музей паэта. У другой палове дня пройдзе цырымонія адкрыцця яго абноўленай экспазіцыі. Адметна, што ў музей паэта варта наведацца нават тым, хто неаднойчы тут бываў. Каб пабачыць новае мастацкае рашэнне экспазіцыі і рэчы, якія толькі нядаўна трапілі ў фонды ўстановы. Найперш — невядомыя аўтографы Максіма Багдановіча: паштоўка на адрас «Нашай Нівы» з просьбай выпісаць для яго газету «рускім шрыфтам» (кірыліцай), дароўны надпіс на адбітку артыкула «Белорусское возрождение», які паэт прэзентаваў рэдактару яраслаўскай газеты «Голос» Мікалаю Дружыніну. З'явіліся ў экспазіцыі новыя дакументы, датычныя Адама Багдановіча, бацькі Максіма. Гэтаксама — куфар Ганны Какуевай стаіць на покуці (сімвалічна?).

Што да мастацкага рашэння, захавалі лепку ў стылістыцы эпохі мадэрн і славутыя люстры, якія рабіліся адмыслова для музея яшчэ ў 1991 годзе. І, вядома ж, сваё месца занялі ўнікальныя вітражы, на якіх — пазнавальныя месцы Мінска, горада, дзе Максім нарадзіўся. Цікава, што тэхніка, у якой ствараліся вітражы, сёння надзвычай рэдкая, таму яны маюць асаблівую мастацкую каштоўнасць.

Сёння адчыніць дзверы і «Беларуская хатка», дзе ўзноўленая атмасфера пачатку XX стагоддзя. Дакументальную аснову складаюць паперы, датычныя як самога Максіма Багдановіча, так і прадстаўнікоў тагачаснай інтэлігенцыі, што гуртавалася вакол «Хаткі» (ёсць і зусім новыя, раней не экспанаваныя дакументы). Сярод імёнаў — Зміткок Бядуля, які і даў прытулак Багдановічу. Цяпер да Максіма літаральна можна зайсці ў госці: мемарыяльны пакой «Хатка», канешне ж, захавала. Як і славутую батлейку, якая цяпер зноў дае прадстаўленні. Акрамя таго, у «Хатцы» будуць праводзіць рэгулярныя музейна-педагагічныя заняткі для дзяцей. Распрацоўваецца таксама адмысловая праграма на час Калядаў, імпрэзы ў межах якой пройдуць і ў музеі Максіма Багдановіча.

Завяршыцца святкаванне Дня Максіма ўжо ўвечары, у яшчэ адным сімвалічным месцы — каля помніка паэту, што на плошчы Парыжскай камуны, каля Опернага тэатра. У **17.30** тут распачнецца памятны мітынг «Пакланіся Максіму».

Натуральна, цэлы дзень будуць гучаць творы паэта — іх прачытаюць дзяржаўныя дзеячы, вядомыя акцёры тэатра і кіно, навукоўцы, школьнікі і студэнты. Музычным суправаджэннем святкавання стануць песні на вершы Максіма. Думаецца, сёння нас чакае сапраўды грандыёзная праграма, і гэта не выпадкова, бо Дзень Максіма — знакавы дзень для ўсіх беларусаў.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*
**Наста ГРЫШЧУК.**

■ Медыяпрастора

# З КЛОПАТАМ ПРА МОЛАДЗЬ — НА МІЖНАРОДНУЮ ПЛЯЦОЎКУ

**У Мінску прайшоў пленум Беларускага саюза журналістаў, на якім прадстаўнікі дзяржаўных і рэгіянальных СМІ абмяркоўвалі мінулы вопыт і разглядалі далейшыя перспектывы.**

**Старшыня Беларускага саюза журналістаў Анатоль ЛЕМЯШОНАК** падвёў вынікі мінулагодняй работы. Актыўная падтрымка моладзі, клопат пра ветэранаў журналіцкай працы, прафесійная актыўнасць і дзейснасць адыгралі сярод беларускіх журналістаў вялікую ролю. У наступным годзе гэтыя кірункі таксама будуць адными з найважнейшых задач.

— Важна, каб наша праца была якаснай, каб яна не выклікала непрымання ці нуды. Думаю, у гэтым кірунку зроблены поспехі, бо апошнім часам многа маладых журналістаў уступаюць у нашыя рады — яшчэ пяць гадоў таму з цяжкасцю ўяўлялася, што мы будзем прымаць па 60 чалавек у саюз, і з іх дзве трэці будуць маладымі спецыялістамі, — адзначыў старшыня БСЖ.

Удзельнікамі пленума таксама выносіліся прапановы і дапаўненні самага рознага кшталту. Так, напрыклад, гаварылася пра неабходнасць змен у кодэксе прафесійнай этыкі журналіста, які заставаўся без рэдагавання з 1995 года. Погляд з сучасных пазіцый не закрануў бы фундаментальныя прынцыпы работы журналістаў, але дазволіў бы больш якасна ацэньваць працу як членаў БСЖ, так і іх апанентаў.

Многа ўвагі ўдзялялася рабоце з моладдзю. Абмяркоўвалася работа электронных рэсурсаў, сацыяльных сетак, якія ўсё часцей пачынаюць пазіцыянаваць сябе як новыя СМІ. Не засталіся без увагі і прэстыжныя журналіцкія конкурсы «Залатая ліцера» і «Дэбют»: удзельнікамі пленума ўносіліся прапановы пашырыць спіс намінацый, уключыць у іх не толькі традыцыйныя, але і сучасныя аспекты прафесійнай дзейнасці. Гэта, на думку выступоўцаў, дапамагло б прыцягнуць увагу маладых, зрабіць іх больш ініцыятыўнымі.

Яшчэ адна прапанова была скіравана на больш цесны абмен вопытам з замежнымі калегамі на аснове выязных кампаній у іншыя краіны. **Генеральны дырэктар БЕЛТА Дзмітрый ЖУК** у гэтай сувязі прапанаваў беларускім журналістам смялей выходзіць на міжнародную пляцоўку.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

■

■ Жыллё

# «ЧАРГАВІКІ» ДАЧАКАЛІСЯ ЛЬГОТНЫХ КРЭДЫТАЎ

**Найбуйнейшы банк краіны пачаў выдачу крэдытаў на будаўніцтва жылых памяшканняў з дзяржаўнай падтрымкай, паведамляе прэс-служба Беларусбанка.**

Крэдыты выдзяляюцца грамадзянам, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, на будаўніцтва жылля тэрмінам карыстання да 15 гадоў. Працэнтная стаўка па крэдыце па дзеючых умовах складае 12% гадавых (працэнтная стаўка, устаноўленая банкам для крэдытаў на нерухомасць, паменшаная на 50% стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі). Аб'ём выдачы крэдытаў абмежаваны лімітам дырэктыўнага крэдытавання на жыллёвае будаўніцтва, прадугледжанага пастановай Савета Міністраў ад 8 лютага 2016 года №103, гаворыцца ў паведамленні банка. Атрымліваецца, што да канца года Беларусбанк выдасць у якасці крэдытаў на будаўніцтва 20 мільёнаў рублёў.

Як патлумачылі нам у Беларусбанку, для таго, каб атрымаць такі крэдыт, чалавеку трэба прынесці ў банк тры абавязковыя дакументы. У першую чаргу, гэта будзе даведка аб тым, што будучы крэдытаатрымальнік лічыцца маючым патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Другой паперкай стане даведка аб даходах кліента, а пры неабходнасці — даведка аб даходах мужа ці жонкі. А галоўным дакументам будзе дагавор з забудоўшчыкам, які пацвярджае, што чалавек уступіў у будаўніцтва менавіта з дзяржаўнай падтрымкай.

Па гэтай лініі кліенту крэдытуецца да 75% ад нарматыўнага кошту будаўніцтва.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

## ГАЛАЛЁДЗІЦА ПРАВАКАВАЛА ТРАЎМЫ

**Ранкам 8 снежня дарога на вучобу, на працу, па справах у Брэсце была амаль што экстрэмальнай. Горад літаральна накрыў ледзяны дождж. Людзі слізгаліся па пешаходных дарожках нібы па катку, некаторыя падалі. Дворнікі не паспявалі пасыпаць тратуары і двары пясчана-салянай сумессю. Грамадскі транспарт спазняўся і выбіваўся з графіка руху.**

Аўтавакзал вымушаны быў адмяніць многія рэйсы. Паводле інфармацыі **начальніка Брэсцкага аўтавакзала Мікалая РАДЗЮКА**, у перыяд з 6 да 8.30 было адменена 20 рэйсаў міжнародных, міжгародніх і прыгарадных зносін. На тэрыторыі вобласці ДАІ аб'явіла план «Надвор'е».

У Пінску зранку наогул некаторы час рух грамадскага транспарту быў паралізаваны ў асобных раёнах горада.

Вядома, у такіх умовах значна павышаецца рызыка атрымання траўмаў. Так, у Брэсце ў першай палове дня толькі станцыя хуткай дапамогі прыняла каля паўсотні выклікаў, звязаных з галалёднымі траўмамі. Толькі ў траўматалагічнае аддзяленне Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай дапамогі звярнулася 25 чалавек. У аднаго з пацыентаў дыягнаставаны пералом косці таза, у двух — пераломы ног. Усе яны ішлі на работу і пасліznуліся.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**<u>У суботнім нумары, 10 снежня,</u> у «Звяздзе» будзе надрукаваны расклад руху цягнікоў рэгіянальных ліній эканомкласа і цягнікоў гарадскіх ліній, якія ўводзіцца ў дзеянне Беларускай чыгункай з 11 снежня. Не прапусціце карысную інфармацыю!**



■ Надвор'е

# Мокры снег з дажджом і да плюс 7

### А на наступным тыдні да нас вернецца зіма, і маразы будуць да мінус 15 градусаў

**На выхадныя цёплае і вільготнае паветра з Атлантыкі прынясе на тэрыторыю Беларусі апошнюю хвалю амаль восеньскага надвор'я, паведамляе <u>галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА</u>.**



У суботу амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Па паўночным усходзе ў асобных раёнах прагназуецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, удзень — ад мінус 1 градуса па паўночным усходзе да 7 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. У нядзелю да нас завітае чарговая хваля атмасферных франтоў, але стане ўжо крыху халадней. На поўначы краіны будзе ісці снег і мокры снег, а на поўдні ападкі ў асноўным у выглядзе дажджу. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, па паўночным усходзе тэмпература паветра панізіцца да 5 марозу. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, на старце наступнага тыдня захаваецца ўплыў франтальных раздзелаў, але тэмпературны фон пачне паніжацца. У панядзелак на большай частцы тэрыторыі пройдзе снег, мокры снег. Чакаецца слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, а ўначы па паўночным усходзе пры праясненнях падмарозіць да мінус 9 градусаў. У аўторак і сераду на тэрыторыі Беларусі пачнуць гаспадарыць зона павышанага атмасферага ціску і халодная паветраная масы, якія рухаюцца з поўначы Еўропы. У асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 4 — мінус 11 градусаў, пры праясненнях — да мінус 15. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 2—9 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■


**ОАО «Белбакалея»**

**извещает, что 23 декабря 2016 года в 10.00**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ**
**акционеров ОАО «Белбакалея»**
**по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал.**

Регистрация участников собрания с 8.30.
При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 12.12.2016 года.

**Повестка дня:**
1. О приобретении акций.
2. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «Белбакалея».

УНП 100025653 *Наблюдательный совет ОАО «Белбакалея»*

**РУП «Белпочта»** УНП 101015738

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ**

**для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Текущий ремонт (замена заполнений оконных и дверных проёмов) в здании общежития РУП «Белпочта» по ул. Надеждинская, 23 в г. Минске».**

**Процедура переговоров состоится «14» декабря 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

Контакты для получения дополнительной информации:
отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29.

**Государственное предприятие «Президент-Отель»**

извещает о переносе даты аукциона на 30.12.2016 г. в 15.30 по адресу: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 104 (конференц-зал «Консул») и продлении по 29.12.2016 года до 16.00 включительно срока приема документов на участие в аукционе, извещение о проведении которого опубликовано в выпуске газеты «Звязда» № 214 (28324) от 04.11.2016 года.

УНП 192287408

# ЖАРТЫ ТУТ НЕ ДА МЕСЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Звычайна апраўданне ва ўсіх адно: я пажартаваў, не думаў, што гэтую фразу могуць успрыняць усур'ёз. Тым не менш, каб выключыць самую малую верагоднасць надзвычайнага здарэння, праводзіцца дэталёвая праверка, выклікаюцца спецыялісты. Іх праца — нятаннае задавальненне, таму і пакаранне за такія «выбуховыя жарты» даволі суровае — да 7 гадоў пазбаўлення волі, — адзначыў Мікалай Глазко.

Яшчэ адна распаўсюджаная праблема — рэчы, пакінутыя на станцыях без нагляду. Аднак выпадкаў, каб іх кідалі знарок, у гэтым годзе зафіксавана не было. Забываюць нешта часцей за ўсё праз няўважлівасць. Пазней высвятляецца, што ў падазроных чамаданах, сумках і пакетах знаходзіцца адзенне, прадукты ці асабістыя рэчы. Аднак да гэтага работа станцыі на пэўны час прыпыняецца, а ўсе пасажыры эвакуіруюцца. Вядома, падобныя выпадкі выклікаюць занепакоенасць, аднак упадаць у паніку не варта: за становішчам старанна сочаць.

Самі пасажыры да ўласнай бяспекі ставяцца досыць пільна. Ужо пагалоскай стала леташняя гісторыя пра дзяўчыну, якая падгледзела змест чужога смс аб «жаданні падарваць метро» і забіла трывогу. У асноўным жа паведамляюць аб пакінутых на пероне рэчах.




Фота Надзеі БУЖАН.

Агляд на станцыях метро праводзіцца выбарачна. Калі спыняць кожнага, гэта створыць вялізныя заторы на самых загружаных станцыях. Таму некаторыя крыўдзяцца, маўляў, у яго сумка на 10 сантыметраў шырэй, а правяраюць мяне. Супрацоўнік службы бяспекі метрапалітэна ці дзяжурны міліцыянер у выбары зыходзіць са сваіх асабістых назіранняў і вопыту. Падазроным можа здацца вобраз чалавека ў цэлым, выкарыстанне рознай сімволікі, адзенне, рэзкія рухі, занадта вялікая, цяжкая ці дзіўная па форме ноша. Калі чалавек пры выкананні службовых абавязкаў просіць вас прайсці з ім для правядзення агляду, ніякіх парушэнняў вашых правоў у гэтым няма. Пры адсутнасці ў вас забароненых прадметаў уся працэдура зойме ад сілы некалькі хвілін. Ёсць тыя, хто абураецца: я тут кожны дзень праходжу, навошта вы мяне зноў і зноў правяраеце? Аднак гэта ні пра што не кажа. Па-першае: усіх, нават пастаянных, наведвальнікаў адной і той жа станцыі запомніць немагчыма, па-другое, калі сёння яны не пранасілі нічога забароненага, гэта яшчэ не гарантыя таго, што і заўтра будзе гэтак жа.

— Нейкіх выпадкаў выяўлення злачынцы толькі па адным поглядзе на яго ў нас не было. Як, напрыклад, калі за мяжой тэрарыста-смяротніка вылічылі па адсутнасці абутку: паводле некаторых рэлігійных уяўленняў, у іншы свет варта пераходзіць босым. Вялікі натоўп людзей у спалучэнні з яго знешнім выглядам і дзіўнымі паводзінамі навялі на падазрэнні, якія аказаліся правільнымі, — прывёў прыклад Мікалай Віктаравіч. — Вядома, такія выключныя выпадкі бываюць рэдка. У больш складаных сітуацыях неабходна карыстацца прынцыпамі прафайлінгу. Пад прафайлінгам маецца на ўвазе сукупнасць псіхалагічных метадаў, якія дазваляюць спрагназаваць паводзіны чалавека на аснове яго знешніх характарыстык і невербальных і вербальных паводзін. Усе супрацоўнікі, якія задзейнічаны ў ахове метрапалітэна, праходзяць спецыяльнае навучанне.

Пры даглядзе, здараецца, сапраўды выяўляюць забароненыя прадметы: халодную ці агнястрэльную зброю, боепрыпасы. Нават калі ў вас у сумцы знойдуць усяго адзін патрон, праход для вас будзе закрыты. Акрамя таго, будзе пачата праверка ў межах крымінальна-працэсуальнага заканадаўства. Пры неабходнасці запытваюцца дадзеныя аб дазволе на захоўванне газавых пісталетаў. Пэўныя прадметы, якія ў нашай краіне знаходзяцца па-за законам, напрыклад кастэты, адразу ж канфіскуюць.

— Нельга сказаць, што некаторыя станцыі вылучаюцца па ўзроўні аховы. Усе абаронены дастаткова добра. Так, на новых ліміях метро будзе больш сучаснае абсталяванне, аднак прынцып арганізацыі сістэмы застанецца ранейшым, — падкрэсліў Мікалай Глазко.

**Калі чалавек пры выкананні службовых абавязкаў просіць вас прайсці з ім для правядзення агляду, ніякіх парушэнняў вашых правоў у гэтым няма.**

Што тычыцца канфліктных сітуацый, то яны ў асноўным адбываюцца на стадыі ўваходу ў метро. Як вядома, у стане алкагольнага ап'янення ён забаронены. Тым не менш не праходзіць і дня, каб такая сітуацыя не выклікала абурэння ў людзей нападпітку. Урэгуляваннем падобных пытанняў і займаюцца супрацоўнікі міліцыі, якія дзяжураць на станцыях. Аднак часам да іх звяртаюцца і з іншымі праблемамі. Напрыклад, калі ў натоўпе губляюць дзяцей або становяцца ахвярай крадзяжу. Увогуле аб'ём работы вялікі, бо штодня сталічным метрапалітэнам карыстаецца больш як 800 тысяч чалавек.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

# АДЧУЦЬ СЯБЕ СЯМ'ЁЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Малыя дзеці такія добрыя, такія шчырыя, — расказвае яна. — І нават самы задзірысты, калі аднойчы рэзка выгаварыла яму за паводзіны, запярэчыў: «Ну што вы, Юлія Юр'еўна, я ж харошы хлопчык». Хіба такому не паверыш? А калі яны пасля абеду спяць у сваіх ложках, нібы анёлачкі, узнікае такое трапятлівае пачуццё, якое я пазней перажывала з маленькім сынам Вадзімам і потым зноў з Васілінкай, — расказвае Юлія.

**Я падрыхтавалася маральна да бяссонных начэй. А яе варта было пакласці ў ложак — малая закрывала вочкі і засынала: ніякага крыку, плачу, патрабавання ўвагі да сябе. Надзвычай доўга я прывучала яе да выражэння сваіх эмоцый, жаданняў.**

У садку маладому педагогу працавалася нядрэнна, але праз некалькі гадоў яна сумясціла сваё захапленне матэматыкай з плённай прафесійнай дзейнасцю: стала індывідуальным прадпрымальнікам па аказанні рэпетытарскіх паслуг. Працаваць з адным вучнем ёй аказалася больш цікава.

Тым часам у маладога матэматыка паявілася свая сям'я, нарадзіўся сынок. Але з сям'ёй не вельмі склалася. Юля і яе муж рассталіся, калі малому было толькі тры гадзікі. Так бывае. Праўда, зрабілі гэта маладыя людзі вельмі цывілізавана і засталіся сябрамі. Бацька ўсяляк падтрымлівае сына. Былыя свякроў і нявестка пры сустрэчах нязменна цалуюцца. А дзяўчына былога мужа часам нават тэлефануе: «Прывітанне, Юля! Падкажы, як лепей зрабіць...» Такія стасункі Юлія лічыць самымі прымальнымі ў іх сітуацыі.

Жылі яны з сынам звычайным жыццём няпоўнай сям'і: у іх асобная кватэра, бабулідзядулі ў адным горадзе. Але аднойчы паехалі ў дзіцячы дом. Тут я перапыніла расказ і папрасіла ўдакладніць, як узнікла рашэнне наведаць дзіцячы дом. Проста сядзелі-сядзелі ля акна і раптам рашылі паехаць?

— Прыкладна так і было, — згадвае Юлія. А потым успамінае больш дакладна:

— Недзе ў шостым ці сёмым годзе пачула аб'яву, што ў Дзень абароны дзяцей Кобрынскі дзіцячы дом праводзіць свята накшталт Дня адкрытых дзвярэй, куды запрашаюць усіх ахвотных. Купілі білеты ды паехалі з сынам. Што мяне ўразіла першы раз, дык гэта песня маманцяняці на канцэрце. Чамусьці яе вельмі любяць ставіць у падобных установах. Яна як быццам бы па тэме, але ў тых сценах гучыць вельмі ж сумна, нават шчымліва.

Першым жаданнем пад уплывам тых эмоцый было хоць нечым дапамагчы дзецям. І Юлія Гуляева сабрала неабходныя дакументы, каб афарміць «гасцявую сям'ю». Яны з сынам сталі запрашаць выхаванцаў дзетдома на выхадныя, на некалькі дзён на канікулах. Абавязкова для дзяцей арганізоўвалі праграму, ездзілі і ў Белавежскую пушчу, хадзілі ў крэпасць. Так працягвалася некалькі гадоў.

— А з Васілінай пазнаёміліся выпадкова. Я туды прыехала, падышла да першага дзіцяці, а супрацоўніца кажа, што ў Васіліны сёння дзень нараджэння. І мяне так разанула. Я ўспомніла годзік свайго сына з гасцямі, падарункамі, шумам-тлумам. Хоць дзіця гэтага ў адзін год не ўсведамляе, але для навакольных — падзея. А тут малая нікому не патрэбная, поўзае, кешкаецца, выглядае такой адзінокай. Узяла на рукі — яна сядзіць ціхенька, як тая мышка, толькі вочы сумныя. Потым мяне здзівляла: дзіця спатыкаецца і не плача. У мяне якраз была такога ўзросту пляменніца, калі яна ўпадзе — увесь шматкватэрны дом чуе. І вось тады адразу нарадзілася жаданне забраць Васіліну зусім. Праўда, ад першага жадання да здзяйснення прайшло паўгода, пакуль былі адладжаны фармальнасці, прыгатаваныя дакументы для атрымання статусу прыёмнай мамы.

Я вельмі хвалявалася, — працягвае маналог Юлія Юр'еўна, — як пройдзе адаптацыя, як дзіця прывыкне да новай абстаноўкі. Ніякай адаптацыі і не было. Васілінка не хадзіла і ў паўтара года. Яе прывезлі, пасадзілі, яна і сядзела спакойна. Спачатку наогул да ўсяго настолькі роўна адносілася, што мяне гэта палохала. Я падрыхтавалася маральна да бяссонных начэй. А яе варта было пакласці ў ложак — малая закрывала вочкі і засынала: ніякага крыку, плачу, патрабавання ўвагі да сябе. Надзвычай доўга я прывучала яе да выражэння сваіх эмоцый, жаданняў. І паступова ўсё праходзіла, усталёўвалася. Цяпер нават бываюць складанасці з паводзінамі ў грамадскіх месцах. Ну, як у многіх дзяцей, — гаворыць мама Юля.

Васіліна Выркоўская мае праблемы са здароўем, галоўная з якіх кваліфікуецца спецыялістамі як затрымка ў развіцці. Дзяўчынка пакуль вельмі дрэнна гаворыць. Фактычна кожны дзень яны з мамай ходзяць на розныя працэдуры, праходзяць курсы лячэння адзін за адным. Медыкі ў прагнозах, як заўсёды, вельмі стрыманыя, але гавораць, што надзея ёсць. І за гэту надзею прыёмная мама трымаецца вельмі моцна. Юля спадзяецца, што ўдасца развіць і выправіць маўленне. Гэта самае галоўнае. Потым можна будзе атрымаць прымальную для жанчыны прафесію накшталт кухаркі альбо швачкі і нармальна ўладкаваць жыццё.



Васілінцы зараз шэсць з паловай гадоў, яна ходзіць у спецыялізаваны садок. Галоўнае, што яна не спыняецца ў развіцці. Яна толькі крыху меншая ростам за сваіх равеснікаў. Усё астатняе — як і ў іншых дзяцей. Цяпер нават цяжка паверыць, што гэты рухавы смяшлівы жэўжык быў некалі сумным ціхім немаўлём.

А нядаўна ў гэтай сям'і многае змянілася: тут паявіўся тата. Гэта вельмі рамантычная гісторыя. Юля і Андрэй пазнаёміліся ў інтэрнэце, у ходзе РПГ-гульні. Інтэлектуальныя інтэрнэт-стасункі падтрымліваліся гадамі. А потым яны сустрэліся ў яго родным Харкаве. Яна была там праездам па дарозе з адпачынку. Дарэчы, Юліны бацькі некалі таксама пазнаёміліся ў Харкаве. Закаханыя заўсёды звяртаюць увагу на супадзенні... А неўзабаве і ён наведаўся ў Брэст. Пазнаёміўся з дзецьмі, сустрэлі разам Новы год. А ў наступны яго прыезд Юля і Андрэй распісаліся ў адзін дзень, нікога не папярэдзіўшы, на здзіўленне сваім родным.

Выпускнік знакамітага Харкаўскага авіяцыйнага інстытута, на той час намеснік дырэктара адной з прыватных кампаній, ён крута памяняў жыццё і пераехаў у Брэст да любімай жанчыны.

Потым прызнаваўся, што вельмі баяўся, ці ўдасца знайсці кантакт з дзецьмі. Сваіх у амаль 40-гадовага Андрэя не было да гэтай пары. Але ўсё склалася як найлепш. З сямікласнікам Вадзімам яны сышліся як два інтэлектуалы з іранічным складам розуму і асаблівым пачуццём гумару. Ну а Васілінка нібы толькі і чакала, калі ў доме паявіцца тата. Яна ўспрыняла другога дарослага ў сям'і з адкрытай дзіцячай душой. Харкаўскія бабуля і дзядуля адразу палюбілі сваю новую ўнучку, песцілі яе мінулым летам падчас прыезду на канікулы.

На адпачынак да мора сёлета ездзілі ўсе разам. Праўда, Васіліна адразу спужалася мора, яе доўга і паступова давялося прывучаць да вады. А ўсё астатняе на адпачынку было проста цудоўна. Усе ўчатырох яны адчувалі сябе сям'ёй.

...Перада мной сядзела шчаслівая жанчына. І ў гэтым, відаць, заключаецца адказ на пытанне, чаму ўзнікла жаданне ўзяць на сябе клопат пра чужое дзіця, пытанне, якое я ставіла сабе, напрошваючыся на сустрэчу з Юліяй. Яна і раней была самадастатковым чалавекам. А цяпер, калі ў жыцці паявілася каханне — выраслі крылы, што адчуваецца. Нягледзячы на тое, што далёка не ўсё складваецца гладка. Напрыклад, муж пакуль не можа знайсці работу. Аказалася, што нават вакансій дворніка ў бліжэйшым ЖЭСе няма...

Яна гаворыць аб тым, што цяпер яны многа смяюцца, што навучыліся выкручвацца з любых сямейных фінансавых крызісаў. Расказвае, што адзенне набываюць у асноўным па інтэрнэце, не купіла ў гэтым сезоне зімовае паліто, бо лічыць, што лепей адкласці нейкую капейку на будучы адпачынак. А цяжкасці існуюць для таго, каб іх пераадольваць. Прыёмнае дзіця ўпісваецца ў сістэму іх каштоўнасцяў — вось што галоўнае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ За кадрам

# ТАК ЗОРКІ СЫШЛІСЯ

## Папулярныя беларускія артысты «спеліся» са спецыялістамі розных прафесій

**На гэтым тыдні стартаваў новы сезон тэлешоу «Дзве зоркі на СТБ» — з падзагалоўкам «Рэдкія кадры». Такое ўдакладненне стваральнікі выбралі невыпадкова. Калі ў першым эпізодзе, які прайшоў вясной, кампанію знакамітым вакалістам складалі ўласна тэлевядучыя «Сталічнага тэлебачання», то цяпер партнёры артыстаў у дуэтах — прадстаўнікі самых розных прафесій: педагог, топ-менеджар буйнога банка, пагранічнік, работнік лесапілкі, міліцыянер, апаратчык прадпрыемства хімічнай прамысловасці, драматычны акцёр, стыліст...**

— Мы іх сабралі з усёй Беларусі, — прызнаецца **намеснік гендырэктара тэлеканала Павел КАРАНЕЎСКІ**, — і паверце, «кадры» сапраўды рэдкія, а галоўнае, усе як адзін — таленавітыя!

Між іншым, да эфіру дайшлі далёка не ўсе: некаторыя патэнцыйныя ўдзельнікі тэлепраекта літаральна ў апошні момант адмовіліся выступаць на музычным судзе, пад агнём глядацкай крытыкі і каментарыяў журы. Затое тыя, хто не пабаяўся выйсці на шырокі сцэнічны прастор, мелі шанц спраўдзіць даўнія мары, атрымаць незабыўны вопыт і значную порцыю адрэналіну, — а камусьці з іх у выніку дастанецца яшчэ і народная слава.

Адны ўдзельнікі сапраўды стараюцца не адставаць ад прафесійных артыстаў у вакальным плане, другія «чапляюць» збольшага экспрэсіўнасцю і харызмай — але на кожнага з іх, безумоўна, цікава глядзець, уяўляючы, што «на яго месцы мог бы быць я». Акрамя таго, як мы заўважылі, у зімовым сезоне «Дзвюх зорак на СТБ» адбылася забаўная ратацыя: адны ўдзельнікі, як тэлевядучыя Антон Мартыненка ці Ірына Марцьянава, пераселі ў судзейскае крэсла, другія, як оперны спявак Эдуард Мартынюк, наадварот, перайшлі ў шэрагі канкурсантаў і адчулі на сабе ўсе хараство чужых ацэнак і меркаванняў...

Праўду сказаць, другі сезон шоу будзе імклівым: у ім усяго 4 тэматычныя канцэрты. Першая праграма — «Беларускія хіты» — ужо выйшла ў эфір 5 снежня, на чарзе — падборкі «Песні з кінафільмаў», «Залаты шлягер» (сусветныя хіты) і, канешне, канцэрт «Наваго́дняя песні». Судзейская калегія, дарэчы, у розных выпусках будзе мяняцца — тэлевізійнікі так і не прызналіся, зроблена гэта дзеля большай аб'ектыўнасці, каб не паспелі абзавесціся любімчыкамі, або проста для разнастайнасці і прыгожай карцінкі. Фінальны ж выпуск, куды трапяць найлепшыя нумары кожнай пары-ўдзельніцы праекта, тэлегледачы ўбачаць 31 снежня — і тады, ужо без дапамогі журы, выберуць народным галасаваннем дуэт пераможцаў.

Зазірнулі ў закулісе праекта «Дзве зоркі на СТБ» і ўбачылі, як прыцiраюцца адзін да аднаго тыя самыя «рэдкія кадры».

— Праспявана шыкоўна! — чуем, як хваліць чарговую пару аўтар ідэі шоу Ягор Хрусталёў.

— Я больш нічога не ўмею, — аджартоўваецца саліст опернай трупы Вялікага тэатра Эдуард Мартынюк, у пару да якога трапіла супрацоўніца пагранічнай службы, старшы лейтэнант Таццяна Новік.

Усяго ў праекце бяруць удзел 14 пар, усе як адна — незвычайныя. Так, адзін з дуэтаў — сямейны. Не хто-небудзь, а заслужаная артыстка Беларусі Іна Афанасьева амаль два тыдні ўгаворвала ўласнага сына, акцёра Нацыянальнага акадэмічнага драмтэатра Івана Стральцова ўсё ж выйсці разам на адну сцэну. І ўгаварыла! «Для мяне гэта абсалютна новы і нязвыклы вопыт, — прызнаўся за кулісамі Іван, — вельмі не хацелася стаць «слабым звяном». Ці хвалююся я? Не тое слова — амаль да дрыжыкаў!»

Затое ўдзельнікі яшчэ аднаго дуэта трымаюць сябе ў руках на зайздрасць усім астатнім. Яшчэ б: яна — заслужаная артыстка Беларусі і дэпутат парламента Ірына Дарафеева, а ён — былы спецназавец і ўладальнік суровай мужчынскай прафесіі — работнік Горацкай лесапілкі, уладальнік яркай знешнасці і экзатычнага імя Шэры-Крыстэль Лакака. Аказваецца, Крыстэль і Ірына ведаюць адзін аднаго далёка не першы дзень: спявачка заўважыла і ўзяла «пад крыло» харызматычнага і тэмпераментнага самадзейнага артыста яшчэ летась, падчас вакальнага конкурсу Федэрацыі прафсаюзаў. Таму знайсці музычнае паразуменне на сцэне абодвум аказалася нескладана.





Як ні дзіўна, але надзвычай арганічна склаўся дуэт-кантраст з бацькі і трэнера знакамітага тэнісіста Мікалая Мірнага і спявачкі, тэлевядучай і шматдзетнай мамы Ларысы Грыбалёвай. Напрыклад, у праграме беларускіх песень яны ператварыліся ў мульцяшную парачку Маша і Мядзведзь — прызнацца, у высачэзным калматым драпежніку з першага позірку цяжка было пазнаць Мірнага-старэйшага. Праган, другі... Мікалай Мірны таемна, бы школьнік, падглядвае ў шпаргалку, дзе запісаныя словы песні, і тут жа атрымлівае строгую заўвагу ад аўтара ідэі «Дзвюх зорак на СТБ» Ягора Хрусталёва: «Мікалай Мікалаевіч, вы двоечнік!».

— Мікалай Мікалаевіч, як вы дазволілі з сабой такое зрабіць?! — пытаюся ў перапынку паміж рэпетыцыямі ў крыху засмучанага «мядзведзя».

— Усё проста. Справа ў тым, што я даўно і добра ведаю Ягора Хрусталёва, люблю ўсе яго тэлепраекты, пачынаючы з 15-гадовай даўніны, таму не мог адмовіцца ад гэтай авантуры і паддаўся на яго ўгаворы паспрабаваць сябе ў новым амплуа. Але пасля сказаў, што гэта першы і апошні раз, надалей я буду выступаць толькі там, дзе прафесійна штосьці разумею. А цяпер трэба адпавядаць — не магу ж я я падвесці Ларыка (*Ларысу Грыбалёву*. — **Аўт.**)! Мы з ёй дамовіліся не крыўдаваць адзін на аднаго, незалежна ад вынікаў.

...Спявак Макс Лорэнс, ён жа першы беларускі ўладальнік Гран-пры «Славянскага базару ў Віцебску» Максім Сапацькоў, выглядае упэўненым і супрацоўніцтвам з партнёркай — стылістам і тэлевядучай Наталі Рашэ — цалкам задаволеным. Пытанню, што прывяло яго на такі аматарскі конкурс, артыст нават здзіўляецца:

— Артыст заўжды, калі толькі хоча развівацца, павінен удзельнічаць у розных праектах! Для мяне гэта — новы вопыт, новыя знаёмствы; у прыватнасці, я пазнаёміўся з таленавітай дзяўчынай Наталі Рашэ: артысткай, нават актрысай і, магчыма, будучай спявачкай — упэўнены, што ў яе гэта атрымаецца, калі яна сама захоча. Мы вельмі хутка знайшлі агульную мову, і мне падабаецца з ёй працаваць — гэта інтэлігентны, разумны і вельмі стыльны чалавек. А што да праекта — тут я проста атрымліваю неверагоднае задавальненне ад працэсу, ад песень, ад сустрэч са знаёмымі артыстамі і музыкантамі...

Тым часам да выступлення рыхтуецца чарговая пара, якая задае публіцы нечаканае пытанне: «Міліцыянеры ў зале ёсць?». Гром апладысментаў выклікае падазрэнне, што міліцыянераў тут не адзін дзясятак. А як інакш, калі «напарніца» артыста Паўла Клышэўскага — суровая і абаяльная, прафесіянал крымінальнага вышуку Наталля Клімовіч. Пакуль рана меркаваць, наколькі паспяховымі будуць выступленні гэтага незвычайнага дуэта маёра міліцыі і хулігана, але тое, што група падтрымкі ў іх адна з самых вялікіх і згуртаваных, — бясспрэчны факт.

...Пакуль адны дуэты выпрабоўваюць сцэну, другія распяваюцца ў закутку або ўжываюцца ў вобразы. Вось пара, якая быццам сышла з пляцоўкі гістарычнага кінафільма: спявак Аляксандр Сухараў і ўладальніца тытула «Настаўнік года-2011», выкладчыца англійскай мовы ў адной са сталічных гімназій Інэса Зубрыліна. Калі артысту да змены розных амплуа не прывыкаць, то педагог да новай ролі прымяраецца з асцярогай.

— Як вас спакусілі на ўдзел у такой рызыкоўнай справе — ацэньваць жа будуць не толькі суддзі, але і гледачы, у тым ліку калегі і нават вучні? — цікавімся ў Інэсы Уладзіміраўны.

— Я авантурыстка, — сцвярджае педагог у 14-м (!) пакаленні, — таму пагадзілася лёгка. Тым больш, сёння мы з Аляксандрам спяваем «Падабаецца — не падабаецца», гэта песня маёй маладосці, ад яе я атрымліваю чыстае задавальненне, і, можна сказаць, з ёй і я сама памаладзела. Хоць вобраз для мяне нязвыклы, але затое цяпер ведаю, што я магу і так!

— Так, нам лёгка і камфортна працуецца разам, — пагаджаецца спявак. — Дух спаборніцтва? Я працую ўнік усякіх конкурсаў, практычна ніколі ў іх не ўдзельнічаў, але цяпер разумею, што трэба ўсё ж такі выходзіць на сцэну і «рваць» публіку. І тут я абсалютна спакойны — ведаю, што мы пераможам.

Дарэчы, выйграць у «Дзвюх зорках на СТБ» жадаюць практычна ўсе ўдзельнікі. А значыць, ёсць усе падставы лічыць, што далей будзе яшчэ больш цікава. Хто з канкурсантаў пераўвасобіцца ў «бандыта-гангстарыта», хто рызыкне дабавіць жаночы вакал у хіт «Любэ», а хто ўвойдзе ў вобраз Мэры Попінс? Каму гледачы будуць падпяваць любімы раманс з «Гардэмарынаў», а каму падтанцоўваць ці то ўсходні танец, ці то лезгінку? Хто здолее перанесці публіку ў зімовае Прастаквашына, а хто стане самым пераканаўчым Дзедам Марозам? Нарэшце, ці трапіць снарад у адну варонку двойчы і ці ўдасца адной з удзельніц, якая ўжо некалі выйграла шоу «Дзве зоркі» на іншым тэлеканале, зноў стаць пераможцай?.. Самыя цікавыя выпускі «Дзвюх зорак на СТБ» выйдуць у эфір 12, 19 і 26 снежня, з паўторам па суботах, — а фінішуе праект, нагадаем, 31 снежня.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**


## «ЗВЯЗДА» НА СВЯТЫ ДОРЫЦЬ... СУВЯЗЬ!

**А што, як не сувязь, самае галоўнае сёння ў адносінах паміж людзьмі? Зыходзячы з гэтага меркавання, мы ў якасці прызоў для розыгрышу сярод падпісчыкаў гэтым разам прапануем прылады для камунікацыі з блізкімі людзьмі і з усім астатнім светам — тэлефоны і планшэт.**

**Тэлефонам сёння нікога не здзівіш, але тут мы падумалі найперш пра нашых сталых чытачоў і пра маладзейшых, якія клапоцяцца аб сваіх бацьках. Зручная клавіятура з вялікімі, добра відочнымі кнопкамі, вялікі экран, дзве SIM-карты — выдатны падарунак для старэйшага ў вялікай і дружнай сям'і. Не забыліся і пра малодшых — галоўны прыз рэкламнай гульні — сучасны планшэт, які падтрымлівае сувязь фармату 4G і мае шмат іншых цікавых і патрэбных функцый.**

**Каб стаць удзельнікам розыгрышу гэтых патрэбных падарункаў, варта толькі аформіць падпіску на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе, запоўніць адзін з купонаў, якія будуць змяшчацца ў газеце на працягу снежня, выразаць яго і даслаць на адрас рэдакцыі. Магчыма, фартуна абярэ менавіта вас.**

**Выпісвайце «Звязду» — будзьце заўжды на сувязі!**

**Умовы рэкламнай гульні «На сувязі са «Звяздой» змешчаны ў нумары ад 3 снежня.**

Планшэт Asus ZenPad 10 Z300CNL-6A025A 000



Мабільны тэлефон Fly FF241 чорны



**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)
на I квартал і I паўгоддзе 2017 года

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ________ (індэкс) ________

Удачы ў розыгрышы!

# ЧЫТАЙЦЕ Ў «ЗВЯЗДЗЕ» ЎЖО Ў СТУДЗЕНІ

**Сам сабе работадаўца: дзе знайсці грошы на ўласную справу і які кірунак выбраць**

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## Аўторак, 13 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10, 22.05 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар 2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы 6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Маскоўскі дэкамерон». 1-я серыя.**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.05** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.45** Дзень спорту.
**0.55 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 22.10** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**9.35, 18.15 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.30, 20.20** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.30, 21.25 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.05, 17.15 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.00, 19.10** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.00, 22.40 Дэтэктыў «Трынаццаць».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.45 Дэтэктыў «Падмані мяне 3».**
**0.35 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 11.55** «Беларуская кухня». Бульбяныя лапуны з грыбной поліўкай.
**8.05, 11.10, 21.05** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.10 «Пастка». Драма, заключная серыя.**
**9.05, 15.30 «Юнацтва генія». Маст. фільм.**
**10.35** М/ф.
**10.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастачкі, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Валяр'яны Жолтак.
**11.30** «Музеі Беларусі». Музей Максіма Багдановіча ў Гродне і Ракуцёўшчыне.
**12.20** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.50** «Святыні Беларусі». Царква Раства Багародзіцы (в. Мураванка Гродзенскай вобласці).
**13.20, 21.20 «Вясна на Зарэчнай вуліцы». Меладрама.**
**14.50, 20.00** «Чатыры смерці Валерыя Чкалава». Дак. фільм.
**16.55, 22.50** «Дыя@блог». Праверачне.
**17.20** «Сустрэчы ў «Букваедзе».
**19.00** «Справы фамільныя». «Сталёвыя браты».
**19.25** «Размаўляем па-беларуску».
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.50** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.30** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — ВРЗ «Гомель».
**10.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва-Мінск» — «Нёман» (Гродна).
**11.55** Гандбол. SEHA-Газпром ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Татран» (Славакія).
**13.25** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Гонка праследу. Мужчыны.
**14.15** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Гонка праследу. Жанчыны.
**15.05** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Эстафета. Мужчыны.
**16.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Эстафета. Жанчыны.
**18.15** Спорт-кадр.
**18.45, 23.10** PRO спорт. Навіны.
**18.55** Баскетбол. Еўракубак. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Бней Герцлія» (Ізраіль).
**20.55** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. Матч у адказ. «Векшэ Лейкерс» (Швецыя) — «Цюрых» (Швейцарыя).
**23.20** Авертайм.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Бесталковыя нататкі».
**19.00** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Адваротны бок Месяца».**
**23.00** «25 гадоў пасля СССР».
**23.50** «Вячэрні Ургант».
**0.30** «Давай пажэнімся!»
**1.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Драма «Таленавіты містар Рыплі».**
**16.15** «Вадзіць па-руску».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**21.55** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**0.20 Маст. фільм «Гараджане».**
**1.45** Дакументальны праект: «Спадчына іншапланетных архітэктараў».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Тонкая грань».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Даішнікі».**
**16.10** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**22.00 Маст. фільм «Сцерва для чэмпіёна».**
**23.50 Маст. фільм «Аддана насць».**
**2.30 Маст. фільм «Апошняя гульня ў лялькі».**
**4.10 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Бедныя сваякі».**
**19.10, 20.40 Серыял «Па гарачых слядах».**
**21.45, 23.10 Серыял «Тайны следства-15».**
**23.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**0.00** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Хвост».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Дэпартамент».**
**23.40** «Вынікі дня».
**0.10 Серыял «Марскія д'яблы».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Камедыя «Мексіканец».**
**13.00 Серыял «Дзеці Арбата».**
**13.50, 19.10** «Хатняя крама».
**14.20 Камедыя «Не бядуй!»**
**15.55, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад». М/ф «Ліс і сабака».
**17.20 Серыял «Па той бок ваўкоў».**
**18.10 Серыял «Правіца Божая».**
**19.25 Серыял «Флэш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Трылер «Падарунак».**
**23.10 Серыял «Ганібал».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.40** Камедыя «Няўдачлівыя».
**11.40, 14.40, 20.20** Серыял «Гатэль «Элеон».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Дах свету».
**15.50, 19.10** Серыял «Вечны водпуск».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**21.30** Камедыя «Фанфан-Цюльпан».
**23.30, 5.00** Серыял «Тут нехта ёсць...»
**0.30** Серыял «Бязмоўны сведка».
**2.30, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 0.10** «Каломба». Серыял.
**12.45** «Эрмітаж».
**13.15** «Мы з Кранштата». Маст. фільм.
**15.10** «Каралі дынастыі Фабержэ». Дак. фільм.
**15.55** «Сацi. Нясумная класіка...»
**16.35, 1.40** Сусветныя скарбы.
**16.55** Геніі і ліхадзеі. Пётр Рэбіндэр.
**17.25** Расійскія зоркі сусветнай оперы. Радзівон Пагосаў.
**18.30** «Адзінка захоўвання».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.15** «Аляксандр Салжаніцын». Дак. фільм. 1-я серыя.
**22.00** «Гульня ў бісер». «Паэзія Фёдара Цютчава».
**22.40** «Гіпакрат». Дак. фільм.
**22.50** «Сірыя. Тут быў рай». Дак. серыял.
**23.35** Мастсавет.
**23.40** Урокі рускай. Чытанні. Д. Хармс. «Старая». Частка 1-я.

### Настальгія

**6.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Гарык Сукачоў і Сяргей Мазаеў. 2011 год.
**7.05** Фільм-спектакль «Сваякі». 1981 год.
**9.00** Канцэрт гуртоў «Машина времени» і «Цветы».
**10.05** Маст. фільм «Небяспечны ўзрост».
**11.35** «Час пік» з У. Лісцьевым. Госць Клара Новікава. 1994 год.
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Мухаморы». 2005 год.
**12.50, 15.40, 17.00, 18.55, 21.40, 23.00, 1.00, 2.35** Музычная настальгія.
**13.00** Дак. фільм «Дзве гадзіны з бардамі».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**17.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Яўген Веснік.
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Футбол у СССР». 2005 год.
**19.05** Спектакль «Марат, Ліка і Леанідзік». Спектакль Маскоўскага тэатра «Ленкам». 1971 год.
**23.20** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Тацяна Акунеўская.
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1984. 2-я частка. 2011 год.
**1.40** Тэлеспектакль «Па старонках «Сатирикона». 1976 год.
**3.00** «Быў час». 2008 год.
**3.55** Маст. фільм «Бумбараш».

### EuroSport 1

**3.30, 7.00, 16.00, 22.00** Снукер. Scottish Open.
**5.00** Веласпорт. Шэсць дзён Амстэрдама.
**6.00** Фігурнае катанне. Фінал. Гран-пры.
**8.30** Футбол. Чэмпіянат MLS. Фінал. «Таронта» — «Сіэтл Саўндэрс».
**10.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**11.15** Watts.
**11.30** Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
**12.30** Горныя лыжы. Кубак свету.
**13.00, 21.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**13.30** Футбол. «ФІФА».
**14.00** Плаванне. Чэмпіянат свету на кароткай вадзе.
**20.30** Конны спорт. Rolex Grand Slam.
**1.00** Аўтаспорт. Серыя Blancpain Endurance.
**2.00** Ралі ERC. Эмоцыі сезона.
**2.30** Фрыстайл. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**0.35** Камедыя «Як украсці брыльянт».
**2.15** Камедыя «Глыток».
**3.50** Камедыя «Татулі».
**5.30** Меладрама «Па прыкметах сумяшчальнасці».
**7.05** Камедыя «Прышэльцы».
**08.55** Камедыя «Прышэльцы 2: калідоры часу».
**11.00** Камедыя «Леа і Беа». 1-я серыя.
**12.25** Камедыя «Леа і Беа». 2-я серыя.
**14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Весяльчакі».
**17.45** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера» (3-я серыя).
**18.30** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера» (4-я серыя).
**19.30** Камедыя «Месяцавая афера».
**21.15** Камедыя «Настаўнік года».
**23.10** Камедыя «Рымскія спатканні».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30, 14.45** «Ёсць адзін сакрэт».
**7.55** «Доктар І...»
**8.25, 19.00, 2.55** «Асколкі». Серыял.
**10.00, 4.30** «Судовыя страсці». Серыял.
**11.45** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**15.15** «Здзелка».
**15.50** «Натуральны адбор».
**16.55, 21.55** «Рэвізора».
**18.00** «Тайны следства». Серыял.
**20.55, 2.05** «Жанна, пажані».
**23.00** «Гісторыі выратавання».
**23.30** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.15** «Іншая жанчына». Камедыя.

### ТБ1000

**6.10, 18.10** Драма «Мой анёл-ахоўнік».
**8.10** Фантастыка «Апошняя Мімзі Сусвету».
**10.10** Меладрама «Тры метры над узроўнем неба: я цябе хачу».
**12.20** Камедыя «А вось і яна».
**14.10** Драма «Доўгія заручыны».
**16.30** М/ф «Прыгоды Дэспера».
**20.10** Фантастыка «Па-за часам».
**22.10** Фантастыка «Пасвячоны».
**0.10** Трылер «Версія».
**2.20** Драма «Быць Флінам».
**4.15** Трылер «Эфект матылька».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Дзень дурня».
**8.05** Драма «Мора».
**9.35** Драма «Івановъ».
**12.35** Дэтэктыў «Дзесяць негрыцянят».
**14.55** Камедыя «Бармен».
**16.35** Драма «9 дзён і адна раніца».
**18.15** Трылер «Уцёкі».
**20.20** Драма «Знаходка».
**22.20** Трагікамедыя «А ранкам яны прачнуліся...»
**0.20** Кінаальманах «Масква, я люблю цябе!»
**2.35** Камедыя «Вяселле па абмене».
**4.40** Меладрама «Прагулка».

### National Geographic

**6.00, 20.15** Гульні розуму.
**6.40, 13.40, 21.00, 0.45, 3.45** Навуковыя недарэчнасці.
**9.40, 17.05** Антарктыка.
**10.30, 17.55** Гады небяспечнага жыцця.
**11.20** Шаша праз пекла.
**12.05, 15.35** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.50** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**16.20, 19.25, 23.15, 3.00** Расследаванні авіякатастроф
**18.45** Зорная размова.
**22.30** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**0.00** Эвакуацыя Зямлі.

### Discovery

**8.00, 14.00** На краі Аляскі.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Бітвы за кантэйнеры.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Хуткія і гучныя.
**12.00** Рэкорды на двух колах.
**13.00** Тэхнагеніка.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Калекцыянеры аўто.
**20.00** Гарады жывыя і мёртвыя.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 4.40** Самагоншчыкі.
**2.00, 6.20** Паляўнічы на цуды.



## ШТО ДБАЦЬ ПРА РЫЗМАНЫ?

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Ліпець** — ледзь-ледзь трымацца. Было відаць, што тут ліпелі да часу людзі і не дбалі, Гразі ніколі не знімалі.

**Дбаць** — праяўляць клопаты, турбавацца. Хто дбае, той і мае.

**Шпацы́р** — прагулка на свежым паветры. Шпацыр прыйшоў да нас з нямецкай мовы праз польскае слова spacer.

**Штанда́р** (уст.) — сцяг адпаведнага колеру. Слова, дарэчы, таксама нямецкага паходжання.

**Рэ́згіны** — прыстасаванне з вяровачнай сеткі для нашання сена. «Алесь зачыніў адрыну, ускінуў на плечы рэзгіны з сенам і паволі пайшоў», — чытаем у Аркадзя Чарнышэвіча.

**Рызманы́** — зношанае адзенне, лахманы.

**На край зямлі** — 1) куды-небудзь вельмі далёка паехаць, пайсці; 2) у любое месца, абы-куды. Беларуская адпаведнікі: дзе Макар козы пасе, за блізкі свет, куды крумкач касцей не заносіў. Руская: куда Макар телят не гонял, на все четыре стороны.

**Ламаць рукі** — даходзіць да адчаю, вельмі перажываць ад вялікага гора. Беларусы яшчэ скажуць: рваць на сабе валасы, кусаць сябе за локаць. Руская: ломать руки, посыпать голову пеплом. Узгадаем радкі з паэмы Янкі Купалы «Бандароўна»:

*Ой, ламалі свае рукі*
*Стары са старою:*
*— Налажылася донька наша*
*За ўсіх галавою...*

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

## Тэлесеткі

## БАГДАНОВІЧ ДЛЯ ЎСІХ

Да 125-годдзя аднаго з класікаў беларускай літаратуры, таленавітага перакладчыка, публіцыста, любімага многімі пакаленнямі чытачоў паэта Максіма Багдановіча тэлеканал «Беларусь 3» падрыхтаваў цэлы шэраг тэматычных праграм і фільмаў. Ужо з 6 снежня яны з'явіліся ў эфіры; а сёння, непасрэдна ў дзень нараджэння паэта, узяў пачатак адмысловы праект «Мой Багдановіч».

З 9 снежня ў эфіры «Беларусь 3» будуць выходзіць відэаролікі, дзе свае любімыя вершы аўтарства Максіма Багдановіча прачытаюць вядомыя беларусы — дзеячы культуры і мастацтва, прадстаўнікі мас-медыя: загадчык літаратурнага музея Максіма Багдановіча Марыя Запартыка, кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька, гендырэктар нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Ігар Поршнеў, музыкант ансамбля «Песняры» Вячаслаў Шарапаў, тэлевядучая Алена Спірыдовіч і іншыя.

Акрамя таго, 125-й гадавіне з дня нараджэння паэта будзе прысвечаны выпуск папулярнай тэлевіктарыны «Размаўляем па-беларуску», што выйдзе 10 снежня, і спецыяльны выпуск праграмы «Музеі Беларусі» 11 снежня, які пазнаёміць гледачоў з экспазіцыямі музейных устаноў у Мінску, Гродне і Ракуцёўшчыне.

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

## Субота, 17 снежня

### Беларусь 1

**6.50** Існасць.
**7.15, 21.40 Меладрама «Найлепшы сябар сям'і». 1—2-я серыі.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Клуб рэдактараў.
**9.50 Серыял «Сваты-3».**
**11.00** 50 рэцэптаў першага.
**12.10** Вялікі сэлфі-тур.
**12.50** Трансфармацыя.
**13.25** Гісторыі рамонту.
**14.05** Здароўе.
**15.15** Краіна.
**15.45 Серыял «Правілы жыцця». 1—2-я серыі.**
**19.05 Камедыя «Кроў з малаком».**
**21.00** Панарама.
**1.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05 М/с «Сябры анёлаў».**
**7.50** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**8.40, 22.05** Тэлебарометр.
**8.45 Серыял «Шчаслівыя разам 3».**
**10.55 Анімацыйны фільм «Санта і чароўны агонь».**



**12.25** Капейка ў капейку.
**13.00** «Нядбайнікі». Пазнавальна-забаўляльнае шоу.
**14.20** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.30** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**16.45** «Бітва экстрасэнсаў. 14-ты сезон».
**18.55** «Вяселле ўслепую». Рэаліці-шоу.
**20.15 Фантастыка «Зыходны код».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

**22.10** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці.
**23.25 Баявік «Кілеры».**

### Беларусь 3

**7.30** М/ф.
**8.00, 12.50, 21.05** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.15** «Старыя казкі».
**8.40 Фільм — дзецям. «Казка пра Зорнага хлопчыка».**
**10.50** «Разам з ім». Дак. фільм.
**11.20 «Чырвонае лісце». Драма.**
**13.05** «Тэатр у дэталях». Спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра «Механічны чалавек».
**13.35** «Музыка беларускага кіно».
**14.25 «Нашы суседзі». Камедыя.**
**15.45** «Мой бацька — Юрый Цвяткоў». Дак. фільм.
**16.35 «Леташняя кадрыля». Меладрама.**
**17.50 «У жніўні 44-га...» Драма.**
**19.45** «Знак лёсу». Дак. фільм.
**20.40** «Калыханка».
**21.20** «Час кіно».
**21.25 «Пяшчотная зіма». Меладрама.**

### Беларусь 5

**7.35, 22.05** PRO спорт. Навіны.
**7.45** Хакей. Турнір чатырох нацый. Славакія — Беларусь.
**9.35** Хакей. Турнір чатырох нацый. Швейцарыя — Францыя.
**11.30** Баскетбол. Еўраліга. ЦСКА (Расія) — «Барселона» (Іспанія).
**13.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове Месца. Спрынт. Мужчыны.
**14.45** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове Месца. Спрынт. Жанчыны.
**16.20** Піт-стоп.
**16.50** Біятлон. Этап кубка свету. Нове Месца. Гонка праследу. Жанчыны.
**17.30** Гандбол. SEHA-Газпром ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Вардар» (Македонія).
**19.00** Козел пра футбол.
**19.20** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове Месца. Гонка праследу. Мужчыны.
**20.05, 22.10** Хакей. Турнір чатырох нацый.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.15** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.05** Тэлечасопіс «Гумарынка».
**13.20** «Удача ў дадатак!» з «Еўраоптам».
**14.00, 16.20 Серыял «Прынц Сібіры».**
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**17.15** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**18.25 Маст. фільм «Вярніся да мяне».**
**21.05** Голас. «Новы сезон».
**23.05** «Усё складзецца».
**23.50** «МаксімМаксім».
**1.00** «Юрый Нікулін. Вялікі смешны».

### СТБ

**6.00** «Дзень беларускага кіно». Зборнік м/ф.
**6.30 «Дзень беларускага кіно». Фільм — дзецям «Дзівосныя прыгоды Дзяніса Караблёва».**
**8.45** «Анфас».
**9.00, 11.35, 13.45 «Дзень беларускага кіно». «Вой, мамач-кі!..» Серыял.**
**11.00** «Мінск і мінчане».
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**5.50** «Вялікі горад».
**16.45** «Самая карысная праграма».
**17.35 «Дзень беларускага кіно». Маст. фільм «Белыя Росы. Вяртанне».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 «Дзень беларускага кіно». Маст. фільм «Скрасці Бельмандо».**
**22.05** Музычнае шоу «Дзве зоркі» на СТБ. Новы сезон. Рэдкія кадры.
**23.55 «Дзень беларускага кіно». Меладрама «Трамвай у Парыж».**

### МІР

**6.25 Маст. фільм «Як Іванка-дурачок за цудам хадзіў».**
**7.55** «Саюзнікі».
**8.20** М/ф.
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Медыцынская праўда».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Звычайны цуд», 1—2-я серыі.**
**13.25** «Цяжар абеду».
**13.55 Маст. фільм «Санта з Маямі».**
**16.15 Серыял «Ніна».**
**23.05 Маст. фільм «Прэзідэнт і яго ўнучка».**
**1.00 Серыял «Расія маладая».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.30 Маст. фільм «Пацук».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20 Маст. фільм «Пакуль не выпаў снег...»**



**13.00** «Наша справа».
**13.15, 14.15 Маст. фільм «Халодная страва».**
**17.00** «Гумар! Гумар! Гумар!»
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** Юбілейны вечар Віктара Дробыша.
**22.40 Маст. фільм «Падсадная качка».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Дэтэктыў «Злачынства будзе раскрыта».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00** Сёння.
**8.40** «Стрынгеры НТБ».
**9.15** «Вуснамі дзіцяці».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.05** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў дадатак!»
**14.15** «Падвойныя стандарты».
**15.10** «Паедзем, паядзім!»
**16.20** «Аднойчы...»
**17.05** «Сакрэт на мільён». Алена Проклава.
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.40 Трылер «На мяжы».**
**23.30** НТБ-бачанне. «Сусветная закуліса. Прыгажосць».
**0.20** «За мяжой».

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.15, 21.10, 23.50** «Надвор'е».
**9.05** М/ф «Бурштынавы замак».
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.40 Камедыя «Кадрыль».**
**11.05 Камедыя «Саламяны капялюшык».**
**13.20** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф «Каты не танцуюць».
**14.30 Серыял «Аднойчы ў казцы».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Айцец Браўн».**
**17.25** М/ф «Машыны казкі».
**17.45, 19.20 Серыял «Ян Флемінг».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.15 Баявік «Праўдзівая хлусня».**

---

### ВТБ

**6.00, 0.40** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Мой тата крутейшы!»
**7.30** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.15** М/ф «Фіксікі».
**8.30** М/ф «Маша і мядзведзь».
**9.00** «Вялікая маленькая зорка».
**10.00, 1.20** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Сям'я 3D».
**13.00** Меладрама «Хатняя работніца».
**15.10** Камедыя «Таксі 3».
**17.00** М/ф «Варушы ластамі!»
**18.40** Драма «Авіятар».
**20.20** «Уральскія пельмені».
**23.30** Жахі «Акулус».
**4.00** «Дурні і дарогі».
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**5.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Казкі... Казкі... Казкі старога Арбата». Маст. фільм.
**12.15** «Астравы». Зіновій Герт.
**13.00** Пернікавы домік. «Капеечная справа».
**13.30** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**14.00, 1.55** «Возера ў моры». Дак. фільм.
**14.50** Да 85-годдзя тэатра «Рамэн». Спектакль «Мы — цыганы». Запіс 1986 года.
**16.10** «Мікалай Слічэнка. Тэатральны леапіс. Выбранае».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** Да 110-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Цфасмана. «Рамантыка раманса».
**18.30** Да 95-годдзя з дня нараджэння Юрыя Нікуліна. «Класіка жанру».
**18.50** «Больш чым каханне». Юрый Нікулін і Тацццяна Пакроўская.
**19.30** 95 гадоў з дня нараджэння Юрыя Нікуліна. «Старыя-разбойнікі». Маст. фільм.
**21.00** Вялікая опера — 2016.
**22.50** Кіно на ўсе часы. «Дарагая». Маст. фільм.
**1.00** «Іншы Канчэлі». Канцэрт у Тбілісі. Запіс 2014 года.
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Эліта Краіны Саветаў». Валянцін Варэннікаў. 2007 год.
**6.55, 8.40, 9.40, 14.20, 15.40, 17.00, 23.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**7.00** «Чалавек і закон. Спецвыпуск». 1994 год.
**7.15** «Рок-урок». Шмат музыкі. 1993 год.
**8.00** Дак. фільм «Настальгія па Ташкенце».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**11.00** «Песня-78». 1-е аддзяленне.
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1983. 2009 год.
**13.40** «Кінапанарама». «Ганна Маньяні». 1983 год. 1-я частка.
**16.00** «Колба часу».
**19.35** «Зямля—Паветра». Сяргей Пенкін. 2003 год.
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** Тэлеспектакль «Малы і Карлсан, які жыве на даху». 1971 год.
**0.00** «Спяем, сябры!» з Тацццяна Візбар. 2007 год.
**1.10** Дак. фільм «Яўген Габрыловіч».
**2.25** Дак. фільм «Аляксандр Разенбаум. Твар у твар».

### EuroSport 1

**2.45, 10.30** Санны спорт. Кубак свету.
**3.30, 7.00, 22.00** Снукер. Scottish Open.
**5.00, 9.30, 16.45, 19.45** Біятлон. Кубак свету.
**9.00, 11.30, 17.45, 1.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**12.15, 14.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**15.45** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**21.00** Зімовыя віды спорту.

### Кінакамедыя

**0.35** Камедыя «Шпіён па суседстве».
**2.15** Камедыя «Дарослая дачка, або Тэст на...»
**3.55** Камедыя «Спатканне».
**5.25** Камедыя «Вяселле па абмене».
**7.05** Камедыя «Леа і Беа» (1-я серыя).
**8.30** Камедыя «Леа і Беа» (2-я серыя).
**10.05** Камедыя «Прышэльцы».
**11.55** Камедыя «Прышэльцы 2: калідоры часу».
**14.00** Камедыя «Выпадковы муж».
**15.45** Скетчкам «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Шайбу! Шайбу!»
**17.35** Камедыя «Месяцавая афера».
**19.15** Меладрама «Амелі».
**21.20** Дэтэктыў «Праклён нефрытавага скарпіёна».
**23.05** Камедыя «Ён горшы за мяне».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00** «Хронікі маскоўскага побыту».
**10.50** «Доказ віны».
**11.25, 1.45** «Мінулае ўмее чакаць». Серыял.
**14.50** «Гадкі Я». Анімацыйны фільм.
**16.25** «Гучныя справы».
**17.30** «Дзевяностыя».
**18.25** «Вулічная магія».
**19.00** «Канікулы строгага рэжыму». Камедыя.
**21.25** «Людзі Ікс 2». Фантастыка.
**23.50** «Каліфрэнія». Серыял.
**0.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**4.40** «Знакі лёсу». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Фантастыка «Паза часам».
**8.10** Трылер «Нічога асабістага».
**10.20** Трылер «Улада страху».
**12.25** Меладрама «Спадарыня пакаёўка».
**14.15** Фантастыка «Пасвячоны».
**16.05** Трылер «Версія».
**20.10** Фэнтэзі «Буйная рыба».
**22.25** Трылер «Прыстанак праклятых».
**0.25** Меладрама «Дарагі Джон».
**2.25** Драма «Куды прыводзяць мары».
**4.30** Фэнтэзі «Як злавіць монстра».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Барцу не балюча».
**8.10** Мюзікл «Стылягі».
**10.35** Трылер «Дамавік».
**12.30** Казка «Цень».
**14.20** Трагікамедыя «А ранкам яны прачнуліся...»
**16.10** Кінаальманах «Масква, я люблю цябе!»
**18.20** Драма «Знаходка».
**20.20** Драма «Weekend».
**22.20** Драма «Іван, сын Аміра».
**1.10** Камедыя «Адной левай».
**2.40** Драма «Пеця па дарозе ў Царства Нябеснае».
**4.35** Меладрама «Гараскоп на ўдачу».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**7.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**8.40** Непакорлівы востраў.
**9.25** Востраў бунтароў.
**10.55** Незвычайныя промыслы.
**11.40** Шаша праз пекла.
**12.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**13.15** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'ядната.
**14.00** Выратаваць планету.
**15.35, 1.35** Расследаванні авіякатастроф.
**23.15, 3.55** Другая сусветная вайна.
**0.00, 4.45** Сваіх не кідаем.
**0.45** Ліхтугі за мяжой.
**2.25** Эвакуацыя Зямлі.
**3.10** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00** Выжыць пасля сэлфі.
**9.00** Паляўнічыя на склады.
**10.00, 22.00** Гарады жывыя і мёртвыя.
**11.00, 23.00** У пошуках скарбаў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00, 1.00** Выжыванне без купюр.
**14.00** Аляска: апошні рубеж.
**15.00** На краі Аляскі.
**16.00, 21.00** Як уладкаваны Сусвет.
**17.00** Тэхнагеніка.
**18.00, 7.10** Хуткія і гучныя.
**19.00, 0.00** Траса Калыма.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**2.00** Бітва з акіянам.
**4.40** Калекцыянеры аўто.

---

## Самыя-самыя

### Дзіўная мова

**Прафесар лінгвістыкі Рольф Тэйл з універсітэта Осла назваў самую дзіўную мову ў свеце. Ёй аказаўся пірахан, з дапамогай якога маюць зносіны піраха — паляўнічыя-збіральнікі, якія пражываюць у Амазоніі, паведамляе выданне ScienceNordic.**



Па словах Тэйла, пірахан з'яўляецца адной з самых танальных моў, іншымі словамі, у якой для адрозніванння сэнсаў выкарыстоўваецца вышыня гуку. Так, словы «сябар» і «вораг» на пірахане пішуцца аднолькава, але вымаўляюцца па-рознаму. Акрамя таго, на ім можна свістаць. Свіст выкарыстоўваюць мужчыны падчас палявання, каб абменьвацца інфармацыяй з таварышамі і не адпужваць дзічыну. Пры гэтым для мовы характэрна самая малая колькасць гукаў (тры галосныя і восем зычных). У пірахане практычна адсутнічаюць лічэбнікі і словы для абазначэння колеру. Колькасць вызначаецца адным з трох слоў («некалькі», «яшчэ больш» або «шмат»), але канкрэтныя лікавыя значэнняў словы не маюць. Калі трэба сказаць пра колер, выкарыстоўваюць слова, якое абазначае прадмет гэтага колеру («кроў» — «чырвоны» або «ліст» — «зялёны»). Таксама ў дзеясловах не існуе часавых формаў.

### 134-гадовы доўгажыхар?

**У ходзе нацыянальнага перапісу насельніцтва ў іранскай правінцыі Курдыстан знайшлі найстарэйшага ў краіне чалавека — 134-гадовага Ахмада Суфі, Press TV.**



Мужчына пражывае ў горадзе Сакез. Паводле прадстаўленых ім дакументаў, ён нарадзіўся ў лютым 1882 года. У Суфі няма родных дзяцей, але ёсць чацвёра прыёмных. Сваякі кажуць пра яго як пра добрага і прыязнага чалавека. Яны таксама адзначылі, што мужчына не мае якіх-небудзь хвароб, адрозніваецца добрым здароўем. Да таго, як перапіс выявіў рэкардсмена, найстарэйшым жыхаром Ірана лічыўся 130-гадовы жыхар горада Кам'яран. Самым пажылым чалавекам у свеце неафіцыйна лічыцца 145-гадовы жыхар Інданезіі Садзімеджа. Але верыфікаваным доўгажыхаром з'яўляецца італьянка Эма Марана з Вероны, якая 29 лістапада святкавала свой 117-ты дзень нараджэння.

### «Трапныя» паліцэйскія

**У штаце Луізіяна (ЗША) супрацоўнікі праваахоўных органаў зрабілі больш за 500 стрэлаў падчас перастрэлкі са злачынцам, але трапілі толькі тры разы, паведамляе The New Orlean's Advocate.**

Вечарам Крыстафер Гарсія праз інтэрнэт дамовіўся аб сустрэчы з незнаёмай жанчынай. Калі яна прыехала, мужчына схлусіў, што працуе ў паліцыі, а затым звязаў і пасадзіў у свой аўтамабіль. Жанчыне ўдалося вызваліцца і збегчы, а ў пагоню кінуліся сапраўдныя паліцэйскія. Машына перавярнулася, Гарсія схаваўся за ёй і пачаў адстрэльвацца. Мужчына здаўся пасля размовы з маці, якую выклікала паліцыя.

Падчас супрацьстаяння вартавыя парадку стралялі больш за 500 разоў, але трапілі толькі тры. Шэрыф патлумачыў, што яго памочнікам перашкаджаў вугал, пад якім машына ляжала ў кювеце, і спрацаваная ў ёй падушка бяспекі. Акрамя таго, ім не хацелася забіваць падазронага.




## СІЛА МОВЫ

Некалі ў ліхія пасляваенныя гады каля нашай гаротніцы цёткі Адаркі сталі круціцца евангелісты, хацелі яе ў сваё кола ўцягнуць, абяцалі дапамагчы — «усіх скорбей» пазбавіць... Ну яна і паслухала — паддалася, схадзіла да іх. Праўда, адзін толькі раз...

А яны ж не адступаюцца, зноў яе клічуць — ды гэтак настойліва, што жанчына спачатку пацярпела, памаўчала, а потым не стрымалася: узяла ды выдала — і дзе менавіта іх бачыла, і куды б ім лепей пайсці...

Толькі тады адчапіліся.

Я думаю, «божыя дзьмухаўцы» гэтыя «ваенгалісты» (як іх цётка Адарка звала) у параўнанні з сектамі, што цяпер на людзей «палююць». Ці не мода пайшла — нейкую новую рэлігію прыдумаць, месіяй сябе аб'явіць. А потым усіх, хто ў гэта паверыў (пазбавіўшы папярэдне рознага непатрэбнага багацця) проста ў рай павесці стройнымі радамі...

Я не без падстаў тое кажу. У найбліжэйшых гарадах што робіцца: у адным па вуліцах ходзяць нейкія хлопцы (з паголенымі галовамі, у жоўтых балахонах) ды распяваюць (калі правільна пачула?): «Хара-крышна, Хара-рама»... Другі «Сведкі Іеговы» аблюбавалі.

Адна з іх, з тых самых сведак (мая суседка расказвала), да яе на базары прычапілася. Так і так, маўляў, у рай прыводзяць толькі яны!..

А Марыя ж баба праваслаўная: выслухала ўсё, а потым у позу стала ды кажа:

— Калі вам паверыць, дык усе мае продкі ў пекле цяпер знаходзяцца... А што ж тады мне ў раі рабіць? Чаго я туды папруся? Адна... Не, ужо лепш да сваіх...

А тут неяк і я сама ледзь на «кручок» не трапіла. Валакуся ў хату са свайго гарода, чую — тэлефон разрываецца. Слухаўку зняла:

— Алё, — кажу ледзь жывая.

На тым канцы провада як узрадуюцца!

— *Здравствуйте! Меня зовут Ольга*, — лапоча нейкая маладзіца. — *Я слышу, как тяжело у вас на душе, и я могу вам помочь! Я расскажу вам о вечной жизни, о рае!*

— Не, — перапыняю, — не трэба. У мяне на душы ўсё нармальна. Проста змарылася. Работы шмат у маім райскім садзе.

А яна ж пра гэта не слухае — далей сваё гне...

Я магла б перапыніць, успомніўшы цётку Адарку, але ж нешта развеселілася — «прыкінулася шлангам» ды пытаю:

— А самі вы якой веры будзеце?

Яна (бадзёранька так) :

— *Мы* — «*Свидетели Иеговы*».

— Але ж славянка?

— *Да, здешняя*.

— Гэта добра, — кажу ёй, — бо нам жа ёсць пра што пагаварыць?

Ну і панесла мяне, як таго Астапа: расказала дзеўцы пра паходжанне славян, пра культуру, пра наша язычніцтва, пабудаванае на гармоніі з Сусветам. Расказала пра багоў і багінь...

Потым спахапілася: нешта ж ніхто не пярэчыць? І не згаджаецца? Можа, чалавек «адключыўся», а я тут распінаюся?

Таму лагодненька так пытаю:

— Вы слухаеце?

— Вой, я так слухаю, так слухаю, — па-беларуску загаварыла спадарыня Вольга. — Шчыры дзякуй вам!

— А за што?

— За мову. Я ніколі не чула такой... жывой.

Тут ужо я, што называецца, «выпаўзшы з асадку», падзякавала: сказала дзяўчыне, што, калі яна захоча яшчэ пагаварыць па-беларуску, то хай тэлефануе — пагаворым і пра мову, і пра «Веды славян».

На тым і развіталіся.

А паклаўшы трубку, я па звычцы ўсё абдумала, расклала па палічках. І (гэта па-першае) заганарылася мовай (бач, як уплывае — нават на «агітатараў»!). А па-другое, «вынайшла» спосаб, як ад іх адчапіцца. Трэба сказаць, што мы, беларусы, радзіму і веру сваю не мяняем. А калі і гэта не спрацуе, то можна, як цётка Адарка, проста пасláць...

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## У НАЧНУЮ ЗМЕНУ

Некалі ў студэнтаў навучальны год пачынаўся з бульбы.

Вось і ў тую восень нашу групу закінулі ўглыб Чэрвеньшчыны. Сталі размяркоўваць, рассяляць па хатах. Дзяўчат на кватэру бралі ахвотней, бо з імі, як лічылася, спакайней. А вось на хлопцаў, «попыту» амаль не было. Ужо думалі, што назад паедзем, але ж падахвоцілася адна бабуля. Сказала, што дровы ў яе не пасечаны, атава не скошана, гной у хляве... Так што, калі дапаможам, — яна аддзячыць. А спаць можам на сене, у гумне.

Выглядала гэта досыць рамантычна. Ды і спалася так...

А раніцай мы выйшлі на працу, на ток — пералапачваць сырую грэчку.

Дагэтуль памятаю вялізную гару зерня, цяжкую рыдлёўку. Спіны пад вечар не гнуліся, рукі — балелі. Але ж кармілі нас добра (штодня на сталах свежына, яшчэ цёплае малачко)... Да таго ж маладыя, здаровыя — павячэраўшы, мы беглі на танцы.

Усё, карацей, было як заўсёды, без прыгод, пакуль аднойчы наша гаспадыня не пажалілася, што занядужаў яе блізкі сваяк, што ёй — кроў з носу — трэба адлучыцца на дзень-другі... А тут, як на ліха, яшчэ і брага ў бочцы «паспела» — трэба гарэлку гнаць...

Мы, сямёра бэйбусаў, запэўнілі гаспадыню, што не зломкі, што ўсе яе хатнія справы бяром на сябе. А што да «вытворчасці самагону», то ў нас нават «ас» свой ёсць (адзін з хлапцоў бацькам дапамагаў)... А таму яна можа спакойненька ехаць і ні аб чым не думаць — «прадукт» мы захаваем...

Бабуля ўзрадавалася і сапраўды паехала, мы — узяліся за справу.

Перш-наперш наш «спец па самагонцы» склаў графік начнога дзяжурства. Паводле яго, кожнаму з сямі хлапцоў, пакуль іншыя спяць, належала гадзіну праседзець «ля апарата»: паманенькy падкідваць дровы і час ад часу каштаваць прадукт, каб, калі паслабее, уліць у чыгун новай брагі.

Восць за гэтым кожны з нашых дзяжурных сачыў вельмі строга...

У выніку чаго ці не кожны новы «зменшчык», перш чым прыступіць да працы, (літаральна) адцягваў папярэдніка, бо сам ён ісці не мог...

Але ж справу мы агулам зрабілі: да раніцы ўся чыста брага была перагнаная, а ўсе хлопцы — ніякія, бо страшэнна «стаміліся».

Праз яе, тую самую «стому», ніхто з нас не змог падняцца, ніхто не пайшоў на ток, каб лапаціць грэчку. На працу ў той дзень выйшлі толькі дзяўчаты...

Але ж яны нас нізавошта «не здалі» б выкладчыку (што выехаў быў у Мінск). Брыгадзірка пастаралася — змяюка, а не жанчына: тут жа сказала кіраўніку, што мы цэлы дзень прагулялі.

Выкладчык мусіў падацца ў нашу хатку, што, вядома ж, нам, жаўтаротым другакурснікам, дабра не абяцала. Наадварот — усё магло скончыцца калі не выключэннем з інстытута, то пазбаўленнем стыпендыі...

Разумеючы гэта, хітраваць ды падманваць мы не сталі: шчыра прызналіся ва ўсім.

Рэакцыя выкладчыка была досыць нечаканай.

— Не сапсавалі хоць брагу? — заклапочана спытаўся ён. — Можа, гадасці якой нагналі?

— Не! Ды што вы?! — абурыліся мы.

— Дык, можа, налілі б пробу зняць...

Мы тут жа ўнеслі трохлітровік, асталі шклянку. Адну...

— Дык і сабе ж капніце... Я што — адзін каштаваць гэта буду?

Пакаштавалі разам.

А бліжэй да вечара нашы знерваваныя дзяўчаты не маглі паверыць вушам: пад вясёлае ды гучнае «Касіў Ясь канюшыну...» мы, сямёра малайцоў на чале з выкладчыкам (любіў ён беларускія песні!), крочылі на танцы.

І назаўтра таксама здзівілі, бо да грэчкі дзяўчат не падпусцілі зусім: самі пералапацілі яе, самі дасушылі.

Брыгадзірка нарадавацца не магла. Але ж зразумела ўсё па-свойму.

— Вось бачыце, — сказала выкладчыку, — падсыпалі ім перцу з імберцам, дык і толк ёсць. А то ж зусім распусціліся...

Выкладчык (ён тады быў дацэнтам, пазней стаў прафесарам) толькі падміргнуў нам.

...А што да бабулі, то дровы ёй мы, вядома ж, пасеклі, атаву скасілі, гной выкінулі, нават платы праявілі.

**М. КАМАРОЎСКІ,**
*г. Орша.*

## СВІНСТВА БЕЗ... СВІНСТВА

Ці не ўсе навaспечаныя гараджане, сумуючы па вёсках ды родных хатах, некалі спалі і бачылі, як займеюць лапікі зямлі, як пабудуюць дачы, як паробяць ля іх гароды, як будуць не толькі адпачываць, але і нешта вырошчваць...

Да драбніц у памяці той час, калі мара наша збылася, калі мы кожную вольную гадзіну стараліся правесці на сваім (!) участачку зямлі. Працы там хапала напоўніцу, бо трэба ж было падымаць дзірван, нешта сеяць, палоць, паліваць...

Платоў паміж участкамі тады не ставілі — проста нацягвалі дрот. Будавалі спачатку адрыны — для захоўвання інструмента.

Больш спрытныя, праўда, замахваліся на дамкі, хлеўчукі таксама ляпілі.

У выніку непадалёк ад нас пачулася спачатку кудахтанне ды кукарэканне, а потым і ... рохканне. Гэта наша суседка, Аляксандраўна, дзвюх свінак завяла. Хацела, каб лепей елі ды хутчэй раслі. А пра нешта іншае думак не мела, хоць свінні ёсць свінні — яны ж жывы не будуць, каб свінства не зрабіць. Альбо шкоды якой...

Неяк да нас данёсся шум. За дротам, па суседчыных градах, бегала свінка, а за ёй гаспадыня з матыкай. Хацела, мусіць, пераняць, загнаць у хлеўчык, ды не тут тое было: свінка, што называецца, «адрывалася» на волі: яна, падлезшы пад дрот, тапталася... па нашым гародзе.

Што тут пачалося — не перадаць! Мае ўнукі пакідалі цацкі і з крыкам панесліся следам.

Свінка на хаду нешта рвала — капустачку, моркву, бурачкі... Дзеці бязлітасна ўсё тапталі. А як рагаталі: праз імгненне ўжо не разабраць было, хто ад каго ўцякае, хто даганяе...

Сілы былі няроўныя, і свінню ў хуткім часе загналі.

Але ж шкоды тая нечаканая госця нарабіла ну вельмі шмат — пасеваў як не было.

Праўда, бачачы шчаслівыя твары ўнукаў, я шкадавала зусім не град. Не паверыце: шкадавала, што свінка так хутка... збегла.

А ўжо дзеці як шкадавалі!..

Незабыўныя імгненні шчасця.

**Раіса ВАСІЛЬЕВА,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***Ад яе ж** — напамін, што сёлета «Вясёлыя і праўдзівыя гісторыі» ў рубрыцы «Алё, народ на провадзе!» не проста друкуюцца. Яны — апроч гэтага — удзельнічаюць у конкурсе — на самую смешную, самую цікавую, самую мудрую...*

*Для таго, каб тройку, пяцёрку, дзясятку вось гэтакіх вызначыць, працуе аж два журы — вялікае чытацкае і маленькае рэдакцыйнае. Яны і будуць падводзіць вынікі — недзе ў пачатку студзеня.*

*Гэта значыць, што час яшчэ ёсць: і ваша гісторыя можа паспець у апошні «вагон».*

*Так што пішыце, дасылайце. І, вядома ж, выпісвайце «Звязду» — газету нашых прадзедаў, дзядоў, бацькоў і, хочацца верыць, унукаў.*

## ■ Неасабісты суб'ектыў

# НЯСКОНЧАНАЯ «БУДОЎЛЯ»



### Чаму нашы дзецi проста не гатовыя да кахання

Ў аматараў рэаліці-шоу «Дом-2», што ўжо каторы год трансліюецца па адным з даступных многім тэлеканалаў і стала нагодай да шматлікіх жартаў і анекдотаў, — бяда: чарговы сезон праекта датэрмінова закрываецца. Прычым арганізатары гэтага вельмі паспяховага па першым часе медыяпраекту прычыну называюць вельмі арыгінальную — удзельнікі адмаўляюцца «будаваць каханне».

Карацей, паляцела ўся задумка дагары нагамі, бо сутнасць усяго шоу была — сабраць маладых лайдакоў з прывабнай знешнасцю і прагай тэлевізійнай славы (пароўну хлопчыкаў і дзяўчынак), змясціць іх у абмежаваную прастору і назіраць у рэжыме рэальнага часу, хто з кім сыходзіцца-разыходзіцца, сварыцца-мілуецца. Як правіла, пары пастаянна мяняліся, здрады былі на кожным кроку, хлопцы кідалі дзевак, дзеўкі — хлопцаў, хапаліся за новую істоту супрацьлеглага полу, спрабавалі «будаваць каханне» ўжо з ёй. Усё гэта — на вачах шматмільённай аўдыторыі, бо прыхільнікаў у шоу хапала: назіраць за чужым прыватным жыццём не праз замочную шчыліну, а на экране тэлевізара вельмі заманліва для многіх. Для тых маладых ды прывабных шоу стала месцам пастаяннай працы, яны станавіліся пазнавальнымі зоркамі (асабліва тыя, хто больш за ўсіх скандаліў ды часцей мяняў кавалераў або паненак). Сыходзілі з такой выгаднай работы рэдка, хіба што выганялі сужыцелі, а калі такая неспадзяванка здаралася, тут жа на кастынг замены імчаў натоўп новых лайдакоў і аматараў лёгкай славы....

А тут — на табе! — крызіс жанру. Ужо ўсе ўмовы ім стварылі, нават, дзеля разнастайнасці, памясцілі «Дом» на нейкім трапічным ці калятрапічным востраве (гэта ж якія выдаткі!). А яны не хочуць «будаваць каханне» — і ўсё тут! Плёскаюцца ў моры, песціцца на сонцы, дзеўкі сварацца не з-за хлопцаў, а з-за прычосак, хлопцы ўвогуле ў гаджэты гуляюць — ім не да дзевак. Небаракі прадзюсары з імі і так, і сяк: і пагражалі, і ўгаворвалі (дзіва што: такі бізнес рушыцца). Але нічога не выйшла, каханне пад цёплым сонейкам будаваць ніхто не стаў, таму ўрэшце ўсіх пагрузілі ў самалёт і з тых Сэйшэлаў звезлі, а шоу цяпер пад пагрозай закрыцця. Бедныя-бедныя гледачы, удзельнікі і стваральнікі!..

З чаго гэта раптам я сёння пра нейкую, мякка кажучы, не зусім разумную, ды яшчэ не з нашага канала, тэлеперадачу размову завяла? Бо і само яе існаванне, і тая шматлікая аўдыторыя, якая трымала і працягвае трымаць ёй рэйтынгі (і некалькі тысяч з гэтай аўдыторыі, я проста ўпэўнена, жывуць і ў нашай краіне), — найбольш яскравае сведчанне таго, як абясцэнілiся ў свядомасці людзей самыя лепшыя пачуцці, дзеля якіх, напэўна, чалавек і нараджаецца на свет. «Будаваць каханне»... І для маладых удзельнікаў згаданага шоу, і для тых, хто штовечар з захапленнем яго глядзіць, і для тых, хто не глядзіць, але выхоўваецца на падобных «каштоўнасцях», — гэта самая звычайная фраза, яна не б'е ні па вачах, ні па вушах. І ў жыцці, як у тым шоу: пабудаваў-пабудаваў з адным — не выйшла — кінуў — пайшоў шукаць іншага, каб пачаць «будоўлю» зноў. Быццам кубікі ці канструктар: надакучыла — разбурыў, пачаў нанова або проста склаў у скрыню і забыўся.

Але якое, скажыце, дачыненне гэта мае ўласна да кахання? Ніякага, толькі ўяўляецца менавіта так. А калі сапраўднае пачуццё ўсё ж даганяе-накрывае (бо яно, аўтаномна ад усякіх сучасных стэрэатыпаў, як і ад чалавечага жадання, па-ранейшаму існуе), а яшчэ і без адказу — вось тады пачынаецца страшнае. Чалавек, асабліва малады, кідаецца ў роспач, бо гэта — непадуладнае, няпростае, непрывычнае, правілам «будоўлі» не падпарадкоўваецца, не дае спакойна жыць. І ўспрымаецца не як шчасце (ці, у горшым выпадку, наканаванне), а як невядомая немач, якой сябры і знаёмыя зусім не хварэюць, спакойна «будуючы» новыя адносіны сёння з адной (адным), заўтра — з іншай (іншым). Немач, якой трэба сароміцца, ад якой трэба пазбаўляцца любой цаной, няхай сабе разам з жыццём...

Вы заўважылі, што ў паведамленнях пра самагубствы падлеткаў, маладых людзей усё часцей стала гучаць фраза: «Мяркуецца, што прычынай стала неразделенае каханне»? Наўрад ці сталі больш жорсткімі аб'екты гэтага пачуцця, якія не адказваюць узаемнасцю. Наўрад ці больш палымяныя, бескампрамісныя і няўцешныя пачуцці і думкі ў тых, хто ў роспачы лезе ў пятлю ці робіць крок у бездань з высокага будынка. Яны проста да кахання — таго дзівоснага пачуцця, дзеля якога робяць адчайныя ўчынкі, адкрываюць новыя зоры, пішуць вершы ці музыку, — не гатовыя, бо лічылі, што ім можна толькі «займацца» або яго «будаваць», і што гэта — адзінае сапраўднае.

...Я не ведаю, што адчуваюць «Рамэа і Джульета з Лунінца»", падлеткі, якія, баючыся, што іх разлучаць (у дзяўчыны былі праблемы з законам), збеглі ў кастрычніку ажно ў Маскву. Цяпер яны вярнуліся, Вераніка засталася на свабодзе, можна сустракацца без перашкод. Вельмі хочацца верыць, што ўсё, што яны рабілі дзеля таго, каб застацца разам, было па сумленні і па пачуццях, а не падгледжана ў нейкім шоу, кіно, ці камп'ютарнай гульні (спадара Шэкспіра не згадваю ў гэтым пераліку знарок).

З РЭШТЫ, час, прычым вельмі хутка, пакажа...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
*alena@zviazda.by*

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ**

***Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 07.10.2016 и 13.10.2016***

# ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей».**

| | |
|---|---|
| **ЛОТ №1** | Капитальное строение с инв. №500/С-41311 по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52/19. Площадь – 2240,0 кв.м. Наименование – Здание специализированное иного назначения (административное здание цеха №24). Назначение – Здание специализированное иного назначения. Земельный участок с кадастровым номером 500000000005000418, пл. 1,4208 га, предоставленным продавцу на праве долевого постоянного пользования, с установленными ограничениями: Санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2,5940 га; Охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1,6738 га; Объект недвижимости обременен договорами аренды. Условия дальнейшего использование объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска |
| **Начальная цена (в т.ч. НДС 20%), BYN** | **1 507 980 руб.00 коп.** |
| **Задаток, BYN** | **150 798 руб. 00 коп.** |
| **ЛОТ №2** | Изолированное помещение с инв. №500/D-7113080 по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52 пом. 1. Площадь – 5132,2 кв.м. Наименование – Помещение многофункциональное. Назначение – Помещение многофункциональное. Земельный учаток кадастровым номером 500000000005000418, пл. 19,9465 га, предоставленным продавцу на праве долевого постоянного пользования (Доля: 1773/2500), с установленными ограничениями: Санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2,5940 га; Охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1,6738 га; Объект недвижимости обременен договорами аренды. Доля в праве постоянного пользования относящаяся к капитальному строению после регистрации перехода прав собственности – 207/12500. Условия дальнейшего использование объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска |
| **Начальная цена (в т.ч. НДС 20%), BYN** | **4 086 908 руб. 80 коп.** |
| **Задаток, BYN** | **408 690 руб. 88 коп.** |
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25. тел. 8 017 286 78 59, факс 8 017 286 76 80 |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25. тел. 8 017 286 78 59, факс 8 017 286 76 80 |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка и лота производится **резидентами** в белорусских рублях на следующие **банковские реквизиты:** р/с 3012000790020 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226 г. Минск, пр-т Победителей, 29. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240, ОКПО 37392696. Оплата задатка и лота производится **нерезидентами** в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты на следующие **банковские реквизиты:** Сч./Acc.: 3012000790020 (**BYN**); Сч./Acc.: 3012000790003 **(USD)** SWIFT CODE: BELBBY2X ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, пр-т Победителей, 29 БИК: 153001226 Банк корреспондент CITIBANK N.A., NEW YORK SWIFT CODE: CITIUS33 Acc.36249772; Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 16 декабря 2016 г.** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 312 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **23 декабря 2016 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» |

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей», размещенном на сайте **www.horizont-group.com, раздел «Аренда: Аукционы»**

**Дополнительная информация по тел.: +375 17 284 94 32; +375 25 684 22 55, +375 29 684 22 55. E-mail: yakovenko@horizont.bn.by**

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **СООО «Ярд-Холл», г. Брест, ул. Интернациональная, 40** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Незавершенное законсервированное капитальное строение (Магазин промышленных товаров)** | Здание специализированное розничной торговли | 3066,6 кв.м | 100/U-65825 | Брестская обл., г. Брест, ул. Интернациональная, 40 |

| | |
|---|---|
| **Примечания** | Процент готовности – 77%, площадь застройки – 1389 кв.м |
| **Составные части и принадлежности** | Подвал, забор |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,2945 га, предоставлен Продавцу на праве аренды для обслуживания здания цеха по 31.01.2110 |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **1 038 000,00 белорусских рублей (BYN)** |

**Задаток 20%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

После подписания договора купли-продажи Предмета аукциона покупатель в течение пяти банковских дней перечисляет на счет продавца 100% цены продажи Предмета аукциона (с учетом суммы перечисленного задатка), без заключения договора залога.
В 5-дневный срок после поступления на счет продавца цены продажи Предмета аукциона Продавец передает, а Покупатель принимает Предмет аукциона, о чем составляется передаточный акт.
Вопросы, связанные с расчетами по коммунальным платежам, за электроэнергию и т.п., стороны согласовывают при подписании договора купли-продажи Предмета аукциона.
Расходы, связанные с составлением, оформлением, удостоверением договора купли-продажи Предмета аукциона, а также расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем права в соответствии с действующим законодательством, в том числе расходы по уплате пошлины, несет Покупатель. Указанные расходы не включаются в цену продажи Предмета аукциона.
Договор купли-продажи Предмета аукциона заключается после предъявления Покупателем копий платежных документов о перечислении Организатору аукциона вознаграждения и суммы затрат, связанных с его организацией и проведением, указанной в протоколе о результатах аукциона в установленном порядке

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **10.01.2017 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **06.01.2017 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

---

**Открытое акционерное общество**

# «Дорожно-строительный трест № 3»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 20 декабря 2016 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О совершении сделки по безвозмездной передаче имущества между ОАО «ДСТ № 3» и ОАО «Мостострой».
2. О внесении изменений в Устав ОАО «ДСТ № 3».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 20.12.2016 г. с 11.00 до 11.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 12.12.2016 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию с 13 декабря 2016 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

**Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-24 – ОЭАиП, Наблюдательный совет.**

УНП 700049607

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. Размер начальной цены и задатка с учетом/до деноминации |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №220880506601000202, площадью 0,1481 га, по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Ахремовецкий с/с, д. Замошье, ул. Новая, участок №19, дом 15А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Середник), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, охранная зона особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озёра»). **Нач. цена**: 2500/25 000 000 руб. **Задаток:** 250/2 500 000 руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №220880506601000203, площадью 0,1482 га, по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Ахремовецкий с/с, д. Замошье, ул. Новая, участок №18, дом 17А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Середник), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, охранная зона особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озёра»). **Нач. цена**: 2500/25 000 000 руб. **Задаток:** 250/2 500 000 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 17.01.2017 в 12.00 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатка и приема документов:** 09.12.2016 с 8.30 по 16.01.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600312060009 в ЦБУ № 205 филиал № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 3000594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области. Условия аукциона: разработать и утвердить ПСД и разрешение на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома; до начала строительства снять на зем. участке плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его в соответствии с проектной документацией |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка с учетом/до деноминации |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221282913101000168, площадью 0,1136 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Суйково, ул. Коммунистическая, 33А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Искровское). **Нач. цена:** 5500/55 000 000 руб. **Задаток:** 550/5 500 000 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314060086 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300894330, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполком |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221281601601000179, площадью 0,0758 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Вымнянский с/с, аг. Вымно, ул. Витебская (между домами №6 и №12) для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения: водоохранная зона водного объекта (озеро Вымно), охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. **Нач. цена:** 1 252,26/12 522 600 руб. **Задаток:** 125,23/1 252 260 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314030058 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Вымнянский сельский исполком |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 27.12.2016 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 09.12.2016 с 8.30 по 26.12.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. Условия аукциона: получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию земельного участка не позднее одного года со дня проведения аукциона; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно проектно-сметной документации |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем.участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся); осуществить строительство с сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос.регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем.участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

---

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
